ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасарод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. дадатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Усіх краёў, злучайцеся! Пралетары

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПЯТНІЦА, 16 мая 1930 г.
№ 112 (3710)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

За разгорнутую бальшавіцкую самакрытыку

У адказ на сыгналы «Зьвязды» аб тым, што барацьба са скрыўленьнямі партыйнай лініі ў галіне калгаснага будаўніцтва разгортваецца ў Аршанскай арганізацыі недастаткова, аб тым, што бюро Аршанскага АК не перамагло яшчэ самага труднага — «хутка прызнаць і выправіць свае памылкі» — мы атрымалі ад бюро АК тэлеграму наступнага зьместу:

«За подпісам Нікіціна Аршанскі акругком абвінавачваецца ў нежаданьні прызнаць свае памылкі па калектывізацыі. Бюро Аршанскага АК катэгарычна пратэстуе супроць гэтага і лічыць, што гэта беспадстаўнае шальмаваньне кіраўніцтва АК. Бюро АК поўнасьцю і безагаворачна прызнала свае памылкі па калектывізацыі, аб чым вядома партарганізацыі, ЦК і ЦКК. Мы за бязьлітасную крытыку нашых памылак, без баязьлівасьці прызнаваць іх, з поўным разуменьнем небясьпекі перагібаў, прынялі і прымаем меры да поўнага выпраўленьня памылак. Мы пратэстуем супроць абвінавачаньняў АК у ігнараваньні дырэктыў ЦК УсеКП(б). У «Зьвязьдзе» ад 11-га мая, за подпісам М., карэспанданцыя, выкарыстоўваючы рад правільных фактаў, шальмоўна іх скажае. Ня ўхіляючыся ад пакараньня за нашы памылкі мы супроць няпраўды. Паслаць «Зьвязьдзе» пастанову аб сваіх памылках, надрукаваўшы ў сваёй газэце, выпускаемай да партканфэрэнцыі. Падрабязны адказ склаўшы дадаткова.—Бюро Аршанскага АК КП(б)Б».

Гэта тэлеграма гаворыць аб тым, што кіраўніцтва Аршанскай арганізацыі ня ўлічила правільных сыгналаў «Зьвязды», не найшло на лініі **поўнага і вычэрпальнага** прызнаньня сваіх памылак, па лініі **поўнай і сапраўды бальшавіцкай самакрытыкі,** нават працягвае ўпарта адстойваць памылкі і не жадае прызнаць іх да канца. Пяройдзем да сутнасьці справы.

Бюро Аршанскага АК заяўляе ў сваёй тэлеграме, што яно «супроць няпраўды», якая, быццам-бы, мае месца ў тых артыкулах і карэспандэнцыях, якія былі зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» і прысьвечаны справе барацьбы з перагібамі ў Аршанскай арганізацыі. Гэта заява Аршанскага АК яшчэ больш нас пераконвае, што бюро АК **не разумее** ўсёй важнасьці і шкодлівасьці тых памылак, якія меліся ў Аршаншчыне і якія да гэтага часу ў некаторых мясцох ня выпраўлены і таму тармозяць справу далейшага разгортваньня калгаснага руху і бальшавіцкай сьлёпы.

Праўда ці няпраўда, што ў аршанскай арганізацыі, як асобнымі раённымі камітэтамі, так і бюро акруговага камітэту былі дапушчаны грубыя скажэньні партыйнай лініі ў практыцы калгаснага руху. Праўда ці няпраўда, што ў Аршаншчыне мела месца шмат фактаў, калі груба парушаўся прынцып добраахвотнасьці, меліся антысерадняцкія перагібы, масавая праца падмянялася грубым адміністраваньнем і г. д. Праўда ці няпраўда, што акруговы камітэт узяў няправільныя ўстаноўкі на перасяльныя тэмпы калектывізацыі раду раёнаў да вясны гэтага году. Праўда ці няпраўда, што кіраўніцтва не даацаніла ўсяго значэньня гэтых памылак і скажэньняў, што АК адразу-жа не правяў неабходнай мужнасьці, каб прызнаць ня толькі памылкі на мясцох, але свае ўласныя памылкі і шпарка ліквідаваць перагібы. Праўда ці няпраўда, урэшце, што кіраўнік аршанскай арганізацыі, сакратар АК т. Віленстовіч на дакумантах, якія сыгналізавалі аб абураюча галавацяпскіх фактах, накладаў бюракратычную рэзалюцыю: «прыняць да ведама і азнаёміць членаў бюро». Усё гэта **факты,** якія АК **ня зможа абвергнуць,** бо яны былі і не прызнаваць іх, гэта значыць, перашкаджаць барацьбе з перагібамі, г. зн. не жадаць сапраўднай бальшавіцкай самакрытыкі.

Спынімся цяпер на самой пастанове Аршанскага АК, якая да самага апошняга моманту ня была надрукавана ні ў якіх органах партыйнай прэсы. Ва ўсёй рэзалюцыі аб памылках у калгасным будаўніцтве па Аршанскай акрузе ёсьць толькі адзін скромны пункт аб памылках самога бюро АК. У чым-жа бюро АК у гэтай рэзалюцыі бачыць **уласныя свае памылкі?** Бюро АК бачыць сваю памылку ў тым, што яно «несваячасова і невыстарчальна рашуча рэагавала і ніякрытычна адносілася да няправільных тэндэнцый асобных раёнаў абвясьціць сябе раёнамі суцэльнай калектывізацыі пры адсутнасьці адпаведнай падрыхтоўкі і стварэньня неабходных умоў, імкненьне фарсаваць тэмпы калектывізацыі, перескокваньне праз формы арцелі да камун, імкненьне ў часе веснавой сяўбы гэтага году поўнасьцю скончыць калектывізацыю бяднацка-сераднацкіх гаспадарак (Дуброўна, Мсьціслаўль, Горкі, Круглае, Расна, Лиды) і толькі ў некаторых выпадках даючы адпор «захапленьням» тэмпамі калектывізацыі (Талачыно, Копысь)»...

Ці можна прызнаць гэты пункт выстарчальным для сапраўды поўнай самакрытыкі? Не, цельга гэтага прызнаць! Бюро АК у гэтым пункце ні аднаго слова не гаворыць аб тым, **у чымжа выказваліся канкрэтныя памылкі самога акруговага камітэту і бюро ў справе кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам па акрузе.** Бюро АК ні аднаго слова не гаворыць аб тых фактах скрыўленьня партыйнай лініі, якія мелі месца ўжо пасьля артыкулу т. Сталіна і дырэктыў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б, і супроць якіх (фактаў) бюро Аршанскага АК ня выступіла з неабходнай рашучасьцю і вострасьцю. Бюро АК ні аднаго слова не гаворыць аб тым, што «захапленьні нерэальнымі тэмпамі калектывізацыі» мелі месца ня толькі ў раёнах, але і ў самым акруговым камітэце партыі. Аб чым гавораць усе гэтыя нашы заўвагі да самакратычнай рэзалюцыі бюро АК? **Яны гавораць аб тым, што нашы сыгналы аб невыстарчальнай самакрытыцы цалкам і поўнасьцю апраўдваюцца і што бюро АК яшчэ не да канца прызнала свае памылкі.**

Уся практыка апошніх месяцаў гаворыць аб тым, што там, дзе барацьба з перагібамі спатыкала супраціўленьне, там дзе невыстарчальна хутка і невыстарчальна поўна прызнаваліся свае памылкі, там мы маем найбольшы процант адліваў з калгасаў, найгоршае становішча з арганізацыйна-практычнай працай у існуючых калгасах і слаба разгортваючуюся бальшавіцкую насеўкампанію. Калі мы возьмем пытаньні са становішчам **сяўбы** на Аршанскай акрузе, дык мы павінны будзем, канстатаваць, што **сяўба ў гэтай акрузе разгортваецца вельмі марудна.** Карэспандэнцыя, якая сёньня публікуецца аб становішчы сяўбы на Аршаншчыне, гаворыць, што ў акрузе засеўны плян яравога кліну выкананы толькі на 16,2 проц., ня гледзячы па тое, што сяўба пачалася ўжо даўно і што там, дзе яна праходзіць нармальна — у калгасах і ў індывідуальным сэктары — пасеў зернявых культур падыходзіць ужо да канца. Карэспандэнцыя адзначае, што значнае адставаньне ў сяўбе, і асабліва ў сяўбе індывідуальнага сэктару, тлумачыцца тымі перагібамі і скрыўленьнямі дырэктыў партыі, якія мелі месца ў часе правядзеньня зямляўпарадкаваньня калгасаў і індывідуальнікаў. Які вывад трэба зрабіць з гэтага вельмі важнага факту? Той вывад, што АК робіць буйную палітычную памылку, калі замест поўнага прызнаньня памылак і іх выпраўленьня, ён прабуе замазваць памылкі і зьнімаць з сябе фактычна палітычную адказнасьць за перагібы ў калгасным будаўніцтве, якія меліся ў акрузе.

На фоне ўсіх гэтых фактаў тэлеграма АК, у такім выпадку, прымае поўны **палітычны сэнс.** Палітычны сэнс гэты заключаецца ў тым, што бюро АК у адказ на **ПРАВІЛЬНУЮ** крытыку, на **ПРАВІЛЬНАЕ** паказаньне раду фактаў ня выпраўленых памылак, адказвае голымі фразамі, якія прыкрываюцца беспадстаўным абвінавачаньнем «Зьвязды» ў «шэльмаваньні кіраўніцтва», абвінавачаньнямі, якія фактычна прыкрываюць нежаданьне АК прызнаваць свае памылкі.

Мы ўпэўнены ў тым, што аршанская партыйная арганізацыя, бязумоўна, здаровая, пойдзе па шляху **сапраўднай бальшавіцкай самакрытыкі** і мабілізуецца паўкола задачы па поўным і безагаворачным прызнаньні ўсіх памылак, якія меліся ў калгасным будаўніцтве ў акрузе. Мы ўпэўнены ў тым, што арганізацыя асудзіць прымірэнчыя адносіны бюро Аршанскага АК да тых памылак, якія меліся ў рабоце самога акруговага партыйнага кіраўніцтва. Раённыя партыйныя канфэрэнцыі і акруговая партыйная канфэрэнцыя пройдуць пад знакам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі і рашучага асуджэньня тых, хто выступае супроць гэтай самакрытыкі, хто ня хоча прызнаваць памылкі, якія мелі месца. **Гэта будзе залогам для далейшага пасьпяховага разгортваньня калгаснага будаўніцтва ў акрузе, для ажыцьцяўленьня палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.**

БССР выканала 29,3 проц. пасеўнага пляну

АРШАНСКАЯ І ВІЦЕБСКАЯ АКРУГІ АДСТАЮЦЬ

Рашучае і хуткае выпраўленьне перагібаў спрыяе узмацненьню тэмпаў сяўбы

Калгасы, якія скончылі сяўбу--на дапамогу бяднацкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам!

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

Паводле даных Наркамзему, **на 10 мая па БССР засеяна 684.491,5 гэкт., што складае 29,3 проц. агульнага пасеўнага пляну калгасаў і індывідуальнага сэктару.**

Асобна на сэктарах ёсьць даныя толькі з 7 округ. Віцебская округа не падала поўных вестак.

У 7 округах **калгасамі засеяна 140.041,6 гэкт.,** што складае **34,6 проц. іх пасеўнага пляну,** індывідуальным сэктарам засеяна **517.888 гэкт.** —30,8 проц.

Па асобных культурах плян выкананы наступным чынам: па збожжавых культурах: калгасамі—на 40,8 проц., індывідуальным сэктарам—на 32,1 проц., па тэхнічных культурах: калгасамі—на 12 проц., індывідуальным сэктарам — на 15,9 проц.; па бульбе: калгасамі—на 21,3 проц., індыв. сэкт.—на 36 проц.; па аднагадовых травах (віцы і сэрадэлі): калгасамі—на 38,1 проц., індыв. сэкт.—на 24,6 проц.; па канюшыне: калгасамі—на 56 проц., індыв. сэкт.—на 37,9 проц. і па іншых культурах: калгасамі—на 21,7 проц., індыв. сэкт.—на 16,7 проц.

У сярэднім па абодвых сэктарах плян выкананы: **па збожжавых культурах—на 33,7 проц., тэхнічных культурах—на 15,3 проц., бульбе—на 33,8 проц., аднагадовых травах—на 27,8 проц., канюшыне—на 44,2 проц.** і інш. культурах—на 18,1 проц.

Па Магілеўскай акрузе калгасы амаль па ўсіх культурах адсталі ад індывідуальнага сэктару — па збожжавых культурах калгасы Магілеўскае акругі выканалі плян па 31,5 проц., індывідуальны сэктар—на 33,9 проц., па тэхнічных культурах: калгасы — на 11,1 проц., індыв. сэктар—на 16,1 проц.; па бульбе: калгасы—на 23,1 проц., індыв. сэктар—на 51,9 проц.; па аднагадовых травах: калгасы—на 29,7 проц., індыв. сэкт. — на 41,3 проц.; па іншых культурах: калгасы —на 12,3 проц., індыв. сэкт.—на 15 проц.

Усяго ў Магілеўшчыне калгасамі выкананы плян на 30,2 проц., індыв. сэкт.—на 35,5 проц.

Трэба сказаць, што **па тэхнічных культурах і па бульбе калгасы адстаюць ад індывідуальнага сэктару па ўсіх округах.** Вось лічбы:

У Бабруйскай акрузе плян па тэхнічных культурах выкананы калгасамі на 16,3 проц., індывідуальным сэктарам—на 21,3 проц., па бульбе: калгасамі—на 18,4 проц., індыв. сэкт.—на 35 проц.

У Менскай акрузе плян па тэхнічных культурах выкананы калгасамі на 4,7 проц., індыв. сэкт.—на 11,6 проц.; па бульбе: калгасамі—на 18,1 проц., індыв. сэкт.—на 31 проц.

Наогул тэмп сяўбы ў большасьці округ разгорнуты яшчэ недастаткова. Асабліва адстаюць: з больш паўдзённых округ—**Бабруйская і Гомельская округі,** з паўночных округ—**Аршанская і Віцебская.**

Так, па Бабруйскай акрузе агульны пасеўны плян па абодвых сэктарах выкананы на 35,4 проц., па Гомельскай акрузе—на 41,2 проц. у той час, калі на паўдзённай—Мазырскай акрузе агульны пасеўны плян выкананы на 52,7 проц. Аршанская округа дала 16,3 проц. агульнага пасеўнага пляну, Віцебская—10,4 проц. у той час, калі Полацкая округа дала 19,7 проц.

Калгасы--на дапамогу індывідуальнікам!

Старшыня праўленьня Белкалгасцэнтру т. **Міцькоў** зьвярнуўся да акруговых, раённых калгасаўваў і праўленьняў калгасаў з лістом, у якім зазначецца, што ў радзе раёнаў асобныя калгасы ўжо поўнасьцю выканалі пляны веснавой сяўбы. Большасьць калгасаў БССР з вялікім посьпехам засяваюць свае палі.

Поравень з тым у радзе округ і раёнаў тэмп сяўбы, асабліва па тэхнічных культурах, усё яшчэ нездавальняючы. Калгасы Магілеўшчыны, напрыклад, на 10-га мая выканалі плян засеву тэхнічных культур **толькі** на 11,1 проц., калгасы Мазыршчыны—на 55 проц., пры сярэднім процанце па акрузе каля 57, калгасы Менскай округі выканалі плян засеву тэхнічных культур на 5 проц., пры сярэднім процанце па акрузе 12.

Весткі з месц сьведчаць, што калгасы не аказваюць выстарчальнай дапамогі індывідуальным бяднацкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам, якія ня маюць магчымасьці ўласнымі сіламі апрацаваць і засеяць свае палі. Нават тыя калгасы, якія ўжо скончылі сяўбу, не арганізоўваюць патрэбнай дапамогі бліжэйшым калгасам, якія адстаюць у сяўбе.

Праўленьні калгасаў павінны прыняць усе меры да поўнага і свячасовага выкананьня плянаў веснавой сяўбы. Бліжэйшымі днямі на сходах калгасьнікаў трэба абгаварыць ход сяўбы ў калгасах, вывяць усе слабыя месцы і распрацаваць практычныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечвалі паскарэньне тэмпаў засеву ў калгасах, асабліва па тэхнічных культурах.

Трэба мабілізаваць актыўнасьць і самадзейнасьць усіх калгасьнікаў па поўнае і абавязковае выкананьне плянаў папырэньня пасеўнай плошчы ў калгасах, шырока ўжываючы мэтад спаборніцтва і прэм'яваньне калгасаў за больш пасьпяховае выкананьне плянаў сяўбы.

Калгасы, якія канчаюць сяўбу, павінны бездакладна арганізаваць дапамогу ў сяўбе калгасам, што адстаюць. Для гэтай мэты трэба поўнасьцю скарыстаць трактарныя калёны, машына-конныя станцыі і інш. магчымасьці, а таксама аказваць дапамогу рабочай сілай тым калгасам, у якіх не хапае сваіх рабочых рук.

Задача калгасаў—ня толькі поўнасьцю апрацаваць і засеяць зямельныя вучасткі, прадугледжаныя пасеўнымі плянамі, але і значна перавысіць іх.

У калгасах Бабруйшчыны не выкарыстоўваецца 14 тон насеньня кармавых буракоў, у калгасах Магілеўшчыны — 27 тон канюшыны, у калгасах Бабруйскай і Аршанскай округ не скарыстана яшчэ 29 тон кукурузы, якая павінна была быць засеяна на сіласны корм.

Калгасаводы і праўленьні калгасаў павінны зрабіць усё магчымае, каб ні адзін фунт насеньня не застаўся нескарыстаным.

Індывідуальныя бяднацка-серадняцкія гаспадаркі ўсё яшчэ адстаюць у сяўбе. Калгасным аб'яднаньням і калгасам трэба значна ўзмацніць дапамогу бяднацка-серадняцкім гаспадаркам—насеньнем, цягавай сілай і інш. сродкамі для поўнага абсемяненьня іх палёў. Не павінна быць ні аднаго калгасу, які-б не дапамог ваколічным бяднацкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам.

Калгасы павінны памятаць, што гэтая дапамога зьвяцца адным з лепшых сродкаў барацьбы супроць кулацкай агітацыі за зрыў веснавой сяўбы.

АРШАНСКІЯ ПРАРЫВЫ

Весткі і лічбы з Аршаншчыны прымушаюць нас біць трывогу.

У выніку дапушчанага галавацяпства і перагібаў, якія ў радзе месц нерашуча выпраўляюцца, сяўба на Аршаншчыне праходзіць злачынна марудна.

Падамо некалькі важнейшых лічбаў. На сёньнішні дзень, ня гледзячы на тое, што ў Аршаншчыне сяўба пачалася ўжо даўно, на акрузе пасеўны плян яравога кліну выкананы толькі на 16,2 проц.

Пасеўны плян у калгасах выкананы на 21,9 проц., а ў індывідуальных гаспадарках на 15,3 проц. Наперадзе ідуць калгасы Горацкага раёну, якія выканалі 29,6 проц. пляну, Расьнянскага — 32,5 проц. і Талачынскага—25,3 проц. Адстаюць калгасы Круглянскага раёну, выканаўшыя плян пасеву яравых на 14,9 проц., Аршанскага—на 18 проц., Багушэўскага—на 19,5 проц., Дрыбінскага—на 19 проц. і Копыскага—на 18,1 проц.

Параўнаўча здавальняюча праходзіць сяўба на індывідуальным сэктары ў Горацкім раёне, дзе плян засеву выкананы на 27,1 проц. Характэрна, што ў Дубровенскім раёне, дзе хаця і было зроблена шмат перагібаў, але, дзякуючы своячасовай і рашучай барацьбе з імі, пасеўны плян ужо выкананы на 28,1 проц., г. зн. лепш, як ва ўсіх іншых раёнах.

Адначасова ў радзе раёнаў мы маем пагражаючае становішча ў галіне выкананьня пасеўных плянаў па індывідуальным сэктары. Напрыклад, у **Багушэвіцкім** раёне індывідуальны сэктар выканаў пасеўны плян толькі на 0.3 проц., у **Талачынскім** на 4,7 проц., у Крупскім —на 5,2 проц., **Круглянскім**—на 7,6 проц., у **Чэрэйскім**—на 9,5 проц.

Гэта зьяўляецца вынікам перагібаў, якія былі зроблены пры зямляўпарадкаваньні калгасаў і пры адводзе зямлі індывідуальнікам. З гэтае прычыны цэлыя вёскі, асобныя гаспадаркі яшчэ не пачыналі сяўбы.

Некалькі прыкладаў. У вёсцы **Новая Тухінь,** Дубровенскага раёну, 31 гаспадарка і да гэтага часу не пачынае ворыва. У вёсцы **Барсукі,** таго-ж раёну, у поле ня выходзяць 46 гаспадарак. У Аршанскім раёне, у вёсках **Арахі. Заложа і Кушэўка** ў поле ня выходзяць 27 гаспадарак. Тыпічным і характэрным у гэтым сэнсе зьяўляецца вёска Нежыва, дзе сяланам, якія не хапелі ўвайсьці ў калгас, адрэзалі вельмі дрэнную балотную зямлю з хмызьняком. Ёю можна карыстацца толькі пасьля мэліярацыі. Калгасу былі адведзены і ўсе гароды індывідуальнікаў. У выніку гэтых злачынстваў каля 40 гаспадарак засталіся амаль што без зямлі.

У Коханаўскім раёне, у вёсцы Вязьмічы, 25 гаспадарак ня выходзяць у поле. У Талачынскім раёне вёска Рыдамель (81 гаспадарка) не пачынала сяўбы, а па 3-х іншых вёсках гэтага раёну 86 гаспадарак таксама ня выйшлі ў поле.

У **Круглянскім** раёне вёска Цецярына (52 гаспадаркі) ня выйшла ў поле, а па іншых 4-х вёсках гэтага раёну ня выйшлі ў поле 72 гаспадаркі.

У **Крупскім** раёне ў мястэчку **Бобр** 72 гаспадаркі не пачыналі яшчэ палявых работ, а ў другой вёсцы гэтага раёну—11 гаспадарак.

У Мсьціслаўскім раёне па 3-х вёсках не пачыналі сяўбы 98 гаспадарак.

Такое-ж становішча назіраецца і ў іншых раёнах Аршаншчыны. Такім чынам, у выніку галавацяпства пры зямляўпарадкаваньні і таго, што з гэтым галавацяпствам не праводзілася рашучай барацьбы, у радзе месц вёскі яшчэ не пачынаюць сяўбы. Усяго ў акрузе ня выйшлі ў поле 1112 двароў. Асноўная прычына таго, што пры зямляўпарадкаваньні індывідуальным гаспадаркам вызначылі зямлю вельмі далёка або вельмі кепскую. Шмат сялян засталося без агародаў. У некаторых раёнах былі такія выпадкі, калі зямлю паблыталі. Зямля **Пятрова** дасталася Іванову, а зямля **Іванова Пятрову.**

Усё гэта ставіць пад пагрозу сяўбу ў Аршаншчыне. Неабходна адзначыць, што там, дзе перагібы былі рашуча і своячасова выпраўлены, там мы маем добрае становішча з сяўбой.

Патрэбны тэрміновыя, рашучыя меры.

К.

АДСТАЮЦЬ З ЗАСЕВАМ ПРАПАШНЫХ КУЛЬТУР

(Клічаўскі раён, Бабруйскай акругі)

У калгасах Бацэвіцкага кусту сяўба збожжавых падыходзіць да канца. Ужо **засеяна больш за ⅔ яравога кліну.** Наогул сяўба праходзіць без асаблівых перашкод. Гэтаму спрыяе добрая арганізацыя працы, дапамога ўстаноў і грамадзкасьці.

Складзеныя пляны сяўбы збожжавых амаль па ўсіх культурах будуць выкананы. **У калгасе імя Леніна (Буцэвічы) наглядаецца перавыкананьне пляну засеву ільну і ячменю.**

Але калгасы адстаюць з засевам прапашных. Сяўба бульбы толькі распачалася—засеяна **ад 15 проц. да 25 проц.** Ёсьць пагроза значнага **недавыкананьня пляну засеву бульбы** з прычыны адсутнасьці насеннага матар'ялу ў райпаляводсаюзе, які ў свой час так «скамбінаваў» з загатоўкай бульбы, што яна была саўтасам **перапрацавана на сьпірт.** Таму калгасам зараз прыходзіцца замест засеву бульбы займацца бульбазагатоўкай і траціць дарагі час.

Вызначэньне норм і расцэнак адкладваюць да канца сяўбы

У калгасе імя Чарвякова (Княжыцы, Віцебскай округі) сяўба разгарнулася на ўсю. За 5 дзён засеяна больш за 40 проц. яравога кліну.

Да гэтага часу не прапрацаваны нормы выпрацоўкі і аплаты працы, што вельмі дрэнна адбіваецца на тэмпе работ. На глебе неарганізаванасьці працы зацікаўленасьці з боку некаторых калгасьнікаў (асабліва серадняцкоў) вытворчай работай калгасу. Яны гавораць: «Як я буду добра зацікаўлен у гаспадарцы, калі я ня ведаю, колькі я атрымаю за сваю працу». А праўленцы гэтыя пытаньні адкладваюць да канца сяўбы. Гэта можа адбіцца на ходзе сяўбы.

У калгасе ёсьць рад актывістых-серадняцкоў, добрых гаспадароў, але іх вопыт не скарыстоўваюць, як сьлед.

Райкалгасаюз зусім не дапамагае калгасу ў галіне наладжаньня арганізацыі працы, яны толькі ведаюць адну справу—выдаваць пасеньне. «Прыяжджаюць і камандуюць без практычнай дапамогі»—гавораць калгасьнікі.

Брыгадзір «Зьвязды» ХАЛЯВІН.

Саўгасы засеялі 13.466 гэктараў

На 11 мая саўгасамі БССР, паводле вестак Белсельтрэсту, засеяна **13.466 гэкт.,** што складае 41,84 проц. пасеўнага пляну саўгасаў.

Калі ўзяць асобныя культуры, дык малюнак наступны: па аўсе саўгасы выканалі 75,6 проц. пляну, ячмені—85,7 проц., бульбе—29,67 проц., кораньплодах—22 проц., сілосных культурах—14,1 проц., віцы на насеньне—145,8 проц., віцы на сена—29,1 проц., сэрадэлі на насеньне—164,4 проц., сэрадэлі на зялёны корм—42,1 проц., канюшыне—65,46 проц., лубіне на ўгнаеньне—2,5 проц.

Як відаць з прыведзеных лічбаў, саўгасы вельмі слаба выконваюць пляны па бульбе, кораньплодах, сілосных культурах і лубіне.

Ня гледзячы на неаднаразовыя сыгналы «Зьвязды» па недапушчальныя адносіны з боку саўгасаў да пасеву ільну і канапель, да гэтага часу **ня прынята рэальных мер для забесьпячэньня выкананьня пляну па гэтых культурах. Мы канстатуем, што дагэтуль яшчэ саўгасы БССР не засеялі пад лён і канопліні аднаго гэктару.**

Белсельтрэст павінен прыняць заразжа тэрміновыя меры да ліквідацыі гэтага прарыву.

***

МАР'ІНА. Саўгас імя 10-годзьдзя БССР на 11 мая засеяў 300 гэкт., што складае 22 проц. пасеўнага пляну.

На аўсе плян выканан на 20 проц., ячмені—на 100 проц., бульбе—на 60 проц., кораньплодах—на 36 проц., віцы на сена—на 16 проц., травах на насеньне—на 24 проц. Зусім не пачалі яшчэ сеюць проса, ільну, канапель, сланечнікаў, кукурузы.

Маламоцныя калгасы і беднякі без дапамогі

Большасьць калгасаў **Калінкавіцкага раёну,** Мазырскай округі, **ужо скончыла засеў аўсу, ячменю, ільну, пшаніцы і культурных траў. Засеў бульбы выкананы на 80 проц.**

Крыху горш праходзіць сяўба ў 16 калгасах (усяго ў раёне 60 калгасаў, у якія ўваходзяць 20,6 двароў), якім не адведзена зямля ў адным месцы і ім прыходзіцца сеяць на раскіданых палосках. Усё-ж гэтыя калгасы **выканалі плян сяўбы на 90 проц..**

Індывідуальны сэктар адстае ад калгасаў: плян выкананы толькі на 75 проц.

У сувязі з адставаньнем індывідуальнага сэктару райком партыі паслаў 19 працаўнікоў у сельсаветы для праверкі хода сяўбы і ліквідацыі непаразуменьня на адводзе зямлі.

Усё-ж трэба сказаць, што раённыя арганізацыі правілі марудзьнасьць у ліквідацыі недахопаў, якія перашкаджаюць сяўбе. Вось, прыклад: калгас імя «Правды» (Прулкаўскі сельсавет) арганізаваўся ў 1923 годзе, цяпер у ім налічваюцца 21 гаспадарка. Паводле пляну, калгас павінен засеяць 228 гэкт. яравога кліну, але, з прычыны недахвату цягавай сілы і рабочых рук, у калгасе можа застацца незасеянымі 20 гэкт. аўсу, 20 гэкт. бульбы, 11 гэкт. лубіну, 10 гэкт. грэчкі, 8 гэкт. ільну і г. д.

Пры наяўнасьці такога катастрафічнага становішча з выкананьнем пасеўнага пляну ў калгасе «Правда», раённыя арганізацыі нічога не зрабілі, каб дапамагчы калгасу выканаць засеў яравога кліну.

У частны бяднацкіх гаспадарак таксама адчуваецца нястача цягавай сілы і яны прымушаны зварачацца за дапамогаю да заможнай часткі вёскі: Раённы КСУ ня прымае ніякіх мер, каб арганізаваць дапамогу беднаце.

Брыгадзір «Зьвязды» А. ШАФАРОНАК.

„Ліст Зіноўева“ ніколі не існаваў

СЭНСАЦЫЙНЫЯ ВЫКРЫЦЬЦІ БЫЛОГА КІРАЎНІКА АНГЕЛЬСКАЙ АХРАНКІ

ЛЁНДАН, 14. Адзін з былых кіраўнікоў Скотлянд-Ярда (ангельская ахранка), які стаяў на чале налёту на Аркос —Віндхэм Чайльдс, у апублікаваных ім мэмуарах заяўляе, што «ліст Зіноўева» ніколі не існаваў. У руках ураду быў толькі ангельскі пераклад рускай копіі гэтага ніколі не існаваўшага арыгіналу.

Спыняючыся на антысавецкіх фальшыўках наогул Чайльдс піша, што ад часу да часу на рынку зьяўляліся фальшыўкі, якія прадаваліся часта за вялікія сумы папітычным і прамысловым арганізацыям. Паводле споў Чайльдса, у яго руках некалькі разоў былі дакументы, якія, нібы, выходзілі з СССР. У адным выпадку ўласнік «дакумантаў» прабаваў прадаць іх францускаму ўраду, рэкамэндуючы падкінуць іх якому-небудзь францускаму камуністаму, а потым зрабіць у яго вобыск і знайсьці гэтыя «дакументы». Чайльдс з жалем канстатуе, што гэта ня было зроблена, а ўласнік гэтых «дакумантаў» пусьціў іх у ход у дні ўсеагульнай забастоўкі ў Англіі. Паводле споў Чайльдса, гэты «джэнтэльмэн», відавочна, разьлічваў, што яго выкарыстаюць для барацьбы з камуністымі ў часе забастоўкі. Гэтага ня здарылася, але за дакументы «джэнтэльмэну» было ўсё-ж заплачана 1½ тыс. фунтаў стэрлінгаў.

Наўрад ці Чайльдса штурхнуў да выкрыцьцяў лібэральны сьветапогляд. У свой час Джэйнсон Хікс заявіў: «Я шчыра думаю, што энтузіязм Чайльдса нават перавышае мой уласны, і калі-б даць яму волю, дык у Англіі ня было-б камуністычнай партыі». Відавочна, што ў ліку стымулаў, якія штурхнулі Чайльдса выступіць з выкрыцьцямі, не апошнюю ролю адыгрывае той факт, што ён вымушаны быў пайсьці ў адстаўку ў сувязі са злоўжываньнямі, выяўленымі ў Скотлянд-Ярдзе. (ТАСС).

Індыя ў агні паўстаньняў

БАРЫКАДЫ НА ДАРОГАХ

ЛЁНДАН, 16. Сялянскі рух у паўночна-заходняй пагранічнай правінцыі Індыі працягваецца з вялікай упартасьцю. У вёсках арганізуюцца групы чырвоных дабраахвотнікаў. Апошнія руйнуюць чыгуначныя шляхі, перарэзаюць тэлеграфныя правады і узводзяць барыкады на гасьцінцах і вясковых вуліцах.

Паліцыя робіць налёты на вёскі, імкнецца разброіць сялян. У пагранічным раёне пры напёце ангельскіх аэраплянаў, адзін апарат упаў. Два лётнікі забіты.

ІНДЫЙСКАЯ БУРЖУАЗІЯ Ў СТРАХУ ПЕРАД РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ РУХАМ

ЛЁНДАН, 14. Як канстатуе карэспандэнт «Дэйлі Гэральд», дэклярацыя віцэкараля Індыі Ірвіна выклікала расчараваньне нават у колах індускай буржуазіі. Аднак, буйная буржуазія, якая спалохалася разьмераў рэвалюцыйнага руху і актыўнасьці рабочых мас, палічыла за лепшае зблізкэньне з урадам. Індыйская гандлёвая палата ў Бамбэі прыняла рэзалюцыю, у якой просіць віцэкараля прыняць дэлегацыю «выдатных індусаў» для перагавораў аб аднаўленьні давер'я да ўраду.

СТАН АБЛОГІ Ў ШАЛАПУРЫ

ЛЁНДАН, 14. У Шалапуры стан аблогі праходзіцца са ўсёй суровасьцю. Арыштаваны сотні людзей. У сувязі з гэтым жыхары пагалоўна ўцякаюць з гораду. У горадзе скансэнтравана 1.800 чал. ангельскай пяхоты. Грузавікі, напоўненыя войскамі, цыркулююць па вуліцах.

ФЭРМЭРЫ АДМАЎЛЯЮЦЦА ПЛАЦІЦЬ ПАДАТКІ

ЛЁНДАН, 14. З Бамбэі тэлеграфуюць: сёньня кампанія непадпараткаваньня зрабіла яшчэ крок наперад. Фэрмэры правінцыі Бардолі парашылі арганізаваць свае ўласныя суды для ўрэгуляваньня спрэчак, а таксама настанавілі не плаціць пазямельных падаткаў і байкатаваць усіх урадавых чыноўнікаў і ўсіх, хто дапамагае ўладам.

НАПАДЫ ДОБРААХВОТНІКАЎ НА НАСЕННЫЯ СКЛАДЫ

ЛЁНДАН, 14. 200 добраахвотнікаў зрабілі сёньня налёт на насенныя дэпо Шырода. Паліцыя параніла 16 чал. і арыштавала 168 чал. Зараз добраахвотнікі канцэнтруюцца ў Бамбэі для таго, каб у трэці раз зрабіць налёт на насенныя дэпо Дхаратапа. На чале добраахвотнікаў ідзе паэтэса Найду. Добраахвотнікі намераны прарвацца праз паліцэйскія і вайсковыя кардоны і захапіць насенныя склады.

МЭТАД ПРАВАКАЦЫІ ДЛЯ ЗАДУШЭНЬНЯ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ

ЛЁНДАН, 14. Як тэлеграфуюць з Бамбэю вёсткі, якія паступаюць з розных частак Індыі, сьведчаць аб тым, што намаганьні рэакцыйных колаў пасеяць нацыянальны і рэлігійны антаганізм, дзе-ні-дзе капчаліся посьпехам. У Какіры (у раёне Пэнджаба) адбыліся сутычкі паміж мусульманамі і індускімі сялянамі, узброенымі сякерамі і пажамі. Пры сутычцы 4 забіта, 12 чал. сур'ёзна паранена.

У Карачы, калі ў знак пратэсту супроць арышту Абаса Тапабджы быў абвешчан «хартал» (дзень нацыянальнай жалобы), усе індускія крамы былі зачынены, крамы-ж мусульман засталіся адчыненымі.

КРЫВАВАЯ РАСПРАВА «РАБОЧАГА» УРАДУ НАД ПАЎСТАНЦАМІ ІНДЫІ

ЛЁНДАН, 15. Бамбэйскай арганізацыяй нацыянальнага кангрэсу выпушчана адозва з поваду крывавага задушэньня паўстаньня

Турксіб — сьцяг новых тэмпаў



25-га красавіка на станцыі Айна-Булат адбылася змычка паўночнага і паўднёвага вучастку Турксібу, аднаго з гігантаў новага сацыялістычнага будаўніцтва СССР. Рэгулярны рух па Турксібе адкрываецца 15-га мая. Асноўныя работы па будаўніцтве Турксібу пачаліся ў 1927 г. Тэрмін пабудовы быў устаноўлены пяцігадовы. Потым гэты тэрмін быў скарочаны ўрадам на год і прыстасаваны да канца 1931 года. Аднак, дзякуючы высокаму працоўнаму энтузіязму ўсяго калектыву работнікаў Турксібу, будаўніцтва скончана на год раней тэрміну, вызначанага апошнім планам.

Даўжыня Турксібу ад Сяміпалацінску да станцыі Лугавая (Сярэдняя Азія) 1.442 кілём. Кошт пабудовы быў вызначаны ў 203 млн. 707 тысяч руб. Аднак, гэты кошт быў зніжаны да 175 млн. руб.

НА ЗДЫМКУ: Там, дзе прайшоў Турксіб.

Сьмерць Фрытыёфа Нансэна

ОСЛО, 15. Памёр ад разрыва сэрца вядомы папулярны дасьледчык і грамадзкі дзеяч Фрытыёф Нансэн, 69 год.

Заўвага: Фрытыёф Нансэн нарадзіўся 10-га кастрычніка 1861 году. Сваё першае падарожжа ў палярныя вобласьці ён зрабіў на «Вікінгу» ў 1882 годзе. У 1888 годзе зрабіў свае падарожжа па Грэнляндыі. У чэрвені 1893 году прадпрыняў падарожжа на вядомым судне «Фраме». Судно загрузла ў льдах на поўнач ад утокі Лены. 1895 годзе пакінуў «Фрам» з мэтай дасягнуць Паўночнае канцавосьсе і дабраўся да 86 градуса 4 мін. паўночнай шырыні, г. зн. да раёну, дзе ашчэ ня ступала нага чалавека. 12-га жніўня 1895 году Нансэн і яго спадарожнікі дасягнулі Зямлі Франца Іосіфа, дзе іх і падабрала экспедыцыя Джаксона.

З 1897 году Нансэн займаў прафэсарскую катэдру ва улівэрсытэце ў Осло. У 1900 годзе кіраваў экспедыцыяй па дасьледваньні мораў паміж Нарвэгіяй і Грэнляндыяй. У 1905 годзе ўпершыню выступіў у ролі палітычнага дзеяча. З 1906 па 1908 год займаў пост нарвэскага пасланьніка ў Лёндане. У 1917-18 г.г. у ПАЗШ. Пасьля вайны быў прызначан Лігай Нацый вярхоўным камісарам па справах ваеннапалонных. У часе вайны арганізуе дапамогу ваеннапалонным. У 1921 годзе Нансэну была дана Нобэлеўская прэмія міру.

У часе голаду па Волзе 1920-21 году быў на чале камісіі па аказаньні дапамогі галадаючым. Быў выбран ганаровым членам Маскоўскага савету.

Нарком Замежных Спраў даручыў пасланьніку СССР у Осло т. Калантай выказаць ад імя савецкага ўраду спачуваньне з поваду сьмерці Фрытыёфа Нансэна нарвэскаму ўраду і сям'і нябожчыка.

Тэлеграма савецкіх вучоных удаве Нансэна

ЛЕНІНГРАД, 14. У сувязі са сьмерцю Фрытыёфа Нансэна Акадэмія Навук СССР адаслала тэлеграму Нарвэскай Акадэміі Навук і ўдаве нябожчыка вучонага са спачуваньнем. Савецкая група аэраарктыкі паслала таксама наступную тэлеграму Нарвэскаму таварыству аэраарктыкі: «Група аэраарктыкі СССР з глыбокім жалем даведалася аб сьмерці вялікага дасьледчыка палярных краёў Фрытыёфа Нансэна, чалавека з вялікім сэрцам і простым характэрам. Імя яго — гэта сымбаль адважнасьці і энэргіі. Яно будзе непарыўна зьвязана з лепшымі старонкамі гісторыі навуковых выкрыцьцяў палярных краёў. Сьветлая памяць аб ім захаваецца ў справах яго. Група СССР просіць таварыства прыняць і перадаць нарвэскім вучоным яе глыбокае спачуваньне».

СПАЧУВАНЬНЕ ПРЭЗЫДЫУМА АСОАВІЯХІМУ СССР

МАСКВА. Прэзыдыум Асоавіяхіму СССР паслаў у Осла наступную тэлеграму:

«6 мільёнаў — перадавы атрад савецкай грамадзкасьці, аб'яднаны ў радах Асоавіяхіму, выказвае свой глыбокі жаль з прычыны сьмерці Фрытыёфа Нансэна — лепшага прыяцеля краю саветаў у гады грамадзянскай вайны, удзельніка многіх работ савецкай навукі і дасьледчай думкі, у асаблівасьці ў галіне арктыкі».

Зьверства ў юга-слаўскіх засьценках

ВЕНА, 12. Атрыманы ліст зьняволенага ў паліцэйскай турме ў Загрэбе (Харватыя). У лісьце зьмешчаны жудасныя падрабязнасьці аб зьверствах, якія робяцца над палітычнымі зьняволенымі. Закутага ў ланцугі харвацкага нацыяналістага **Зьбіка** пасадзілі ў камэру, у якую пусьцілі рой пчол. Харвацкаму нацыяналістаму **Капгіновічу** разьбіта грудная клетка. Харвату **Старчэвічу** і іншым зьняволеным некалькі дзён не давалі яды, каб прымусіць іх да пакаяньняў. Іх пасьля прывялі да начальніка паліцыі, які разам з сышчыкамі сядзеў за раскошнай ядою. Паліцэйскія гіранічна крыкнулі: «Няхай жыве вольная Харватыя. Ці не галодны вы, панове?».

Падрыхтоўка да працэсу супроць камуністых і рэвалюцыйных рабочых адбываецца ў поўнай таямнасьці. Дыктатура не адважваецца ўсіх арыштаваных камуністых і рабочых адразу аддаць пад суд, бо масавага працэсу такіх разьмераў нельга было-б укрыць.

10 красавіка камуністыя **Самуэль Леві з 13 таварышамі прыгавораны агулам да 51 году зьняволеньня.** Гэтымі днямі чакаецца **працэс супроць 38 рабочых,** арыштаваных ашчэ ў сярэдзіне 1929 году. Гэтыя таварышы сядзелі паўгода ў паліцэйскім арыштным доме, дзе падпадалі пад жорсткія катаваньні. Там-жа на працягу 3-х месяцаў сядзяць 14 рабочых з гораду Белавару (Харватыя).

Работніцу **Анну Чордыч** прывялі з больніцы для туберкулёзных і штодзённа гадзінамі зьбівалі бізуном, разьдзяваючы яе дагала. Ня гледзячы на катаваньні, яна не давала паказаньняў. Пасьля яе ўкінулі ў камэру і не даюць ёй лекавай дапамогі.

Большасьць з гэтай групы абвінавачваецца ў тым, што яны дапамагалі палітычным зьняволеным.

Друку забаронена публікаваць прозьвішчы арыштаваных і паведамляць аб палітычных працэсах. Таксама забаронена сувязь зьняволеных са сваякамі.

Бязупынны рост беспрацоўя ў краёх капіталу

ЗАКРЫЛАСЯ 495 ФАБРЫК У АДНЫМ ТОЛЬКІ ТОКІЁ

ТОКІЁ, 14. У выніку закрыцьця 945 дробных фабрык у адным толькі Токіё на працягу красавіка, пазбавіліся работы 20.000 рабочых. Дробныя ўласьнікі, ня маючы сродкаў выплаціць рабочым зарплату, хаваюцца і прадпрыемствы часова кіруюцца рабочымі.

Рост беспрацоўя ў Англіі

ЛЁНДАН, 14. На 5-е мая ў Англіі афіцыйна зарэгістравана 1.712.000 беспрацоўных, на 233.000 больш чым у пачатку гэтага году.

СКЛІКАНЬНЕ КАНФЭРЭНЦЫІ БЕСПРАЦОЎНЫХ У АМЭРЫЦЫ

НЬЮ-ЁРК, 13. Нацыянальнае бюро саветаў беспрацоўных падрыхтоўвае скліканьне нацыянальнай канфэрэнцыі беспрацоўных у Чыкаго на 4-5 ліпеня. Ва ўсіх прамысловых цэнтрах ад мясцовых саветаў беспрацоўных вылучаюцца дэлегаты. Чыкаго дасьць 1.000 дэлегатаў, Нью-Ёрк—315, Дэтройт — 300, Філядэльфія—200 і г. д. На канфэрэнцыі будуць таксама прысутнічаць дэлегаты рэвалюцыйных прафсаюзаў.

УСЕСАЮЗНАЯ АЎТА-МОТА-ВЭЛЁ ЭСТАФЭТА

МАСКВА, 13. ВСФК СССР прызнаў неабходным арганізаваць у дзень 16-га зьезду УсеКП(б) усесаюзную аўта-мотавэлё эстафэту. Эстафэта накіроўваецца ў Маскву па 8-мі напрамках: з Архангельску, Ленінграду, Менску, Адэсы, Тыфлісу, Сьвярдлоўску, Сталінграду і Сэвастопалю. Фініш эстафэты адбудзецца ў Маскве, на стадыёне «Дынамо», у апошнія дні пасяджэньняў партызезду. Асноўная ідэя эстафэты — перадача калектыўнага рапарту 16-му партызезду ад імя фізкультурных арганізацый Савецкага Саюзу. На шляху эстафэце будуць перададны рапарты фабрык і заводаў з канкрэтнымі вынікамі сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і выкананьня пяцігадовага пляну. На адваротным шляху ўдзельнікі эстафэты перададуць адказы рапартуючым прадпрыемствам і растлумачаць пастановы партызезду. Асноўны кадр эстафэтных каманд — вялёсьпедыстыя. Усім мясцовым арганізацыям запрапанавана неадкладна стварыць штабы садзейнасьці эстафэце.

ДАКЛАД тав. УНШЛІХТА

на IX партыйнай канфэрэнцыі БВА

Крызіс капіталістычнай гаспадаркі

Першую частку свайго дакладу тав. Уншліхт прысьвячае дэтальнаму аналізу міжнароднага становішча.

Капіталістычны сьвет уступіў у палясу вострага эканамічнага крызісу. Цалкам і поўнасьцю апраўдалася ацэнка, даная VI Кангрэсам Камінтэрну так званаму «трэцяму перыяду» пасьляваеннага разьвіцьця капіталізму. Жыцьцё абвергла тэорыі правых аб доўгай і моцнай стабілізацыі капіталістычнай эканомікі, аб «арганізаваным капіталізьме».

Гаворачы аб ходзе крызісу ў ПАЗШ, дакладчык напамінае аб тым, што яшчэ ў маі 1929 г. тав. Сталін указаў на нямінучасьць гэтага крызісу. Частковае паляпшэньне кан'юнктуры ў студзені і лютым 1930 г. ні ў якой меры не гаворыць аб зьмякчэньні крызісу, бо ў сакавіку адбыўся новы рэзкі напад. Агульны індэкс гаспадарчай дзейнасьці ў ПАЗШ раўняўся ў сакавіку 89,4 супроць 108,8 у маі 1929 г. і 94,6 у сьнежні 1929 г., г. зн. зьяўляецца найбольш нізкім за ўвесь пэрыяд крызісу.

Падрабязна спыняецца тав. Уншліхт на становішчы ў фашысцкай Польшчы. Чым тлумачыцца глыбокі эканамічны крызіс у Польшчы? Перш за ўсё вузкасьцю ўнутранога рынку, потым наяўнасьцю фэадальных перажыткаў і залежнасьцю Польшчы ад замежнага капіталу.

Стабілізацыя, якая мела месца ў Польшчы, як і ў радзе іншых капіталістычных дзяржаў, насіла спэцыфічны кан'юнктурны характар. Рацыяналізацыя праводзілася не на аснове ўздыму на больш высокі ўзровень тэхнікі, а выключна шляхам нічуванай эксплёатацыі рабочай клясы. Так, напрыклад, у вугольнай прамысловасьці прадукцыйнасьць працы аднаго рабочага ў дзень у 1913 годзе складала 1.202 кілёграмы ў дзень, у 1922 г.—594, а ў 1928—1.355.

Аграрны крызіс набыў катастрафічныя разьмеры. Цана на жыта ў чэрвені 1928 г. складала 50 злотых за цэнтнэр, а ў лютым 1930 г. яна панізілася да 20 злотых. Крызіс вядзе да дэградацыі сельскай гаспадаркі. Тэкстыльная прамысловасьць скарацілася на 91 проц., машынабудаўнічая — на 50 проц. З поўнай нагрузкай працуе адна толькі ваенная прамысловасьць. Лік беспрацоўных і часткова працуючых складае 50 проц. усяго ліку рабочай клясы. Беспрацоўныя выходзяць на вуліцу, адбываюцца крывавыя сутычкі з паліцыяй. Разгортваецца рэвалюцыйнае змаганьне рабочых і сялян у Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі.

Падзеі ў Польшчы разьвіваюцца з вялізарнай хуткасьцю. Фашысцкі ўрад траціць апору ў сярэдняй і дробнай буржуазіі. Фашызм шукае ліхаманкава выхаду з крызісу, і гэты выхад агрэсыўным групам мысьліцца ў новай вайне.

З асаблівай рэзкасьцю вынікі сусьветнага крызісу праяўляюцца ў гігантскай форме беспрацоўя.

Рост рэвалюцыйнага руху з поўнай відавочнасьцю выкрыўся ў баявых дэманстрацыях пралетарыяту 1-га мая, якія прайшлі пад лёзунгамі рэвалюцыйнай барацьбы ў абарону Савецкага Саюзу, барацьбы з беспрацоўем, барацьбы супроць міжнароднага фашызму. Калі 200 тысяч рабочых Бэрліну прынялі ўдзел у грандыёзнай дэманстрацыі. Вялікія дэманстрацыі адбываліся ў Варшаве, у Лёндане, у Сасновіцах і інш. тарадох Польшчы; было шмат параненых і забітых. У Парыжы баставала звыш 300 тысяч рабочых. Вялікія дэманстрацыі адбываліся ў Чэха-Славакіі. У дэманстрацыях на вуліцах Нью-Ёрку прымала ўдзел 150 тысяч чалавек.

Тав. Уншліхт спыняецца потым на падзеях у Кітаі і ў Індыі, пасьля чаго робіць агульныя вывады. Крызіс капіталізму набыў сусьветны характар. Няма ніякіх адзнак зьмякчэньня яго, наадварот, ён усё паглыбляецца і абвастраецца, узмацняючы развал капіталістычнай стабілізацыі. У выніку ўзмацнілася наступленьне капіталу па працу, завастрыліся супярэчнасьці паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі, нячувана ўзмацнілася агрэсія супроць СССР. Магутна разгортваецца рэвалюцыйны рух у капіталістычных краёх і калёніях.

У палясе вялікага будаўніцтва

Цэлым радам лічбаў тав. Уншліхт ілюструе грандыёзныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашым краі.

Зазначыўшы на тое, што ў галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі мы ад 870 тысяч гэкт. пасеўнай плошчы калгасаў у 1926-27 г., 1.700.000 гэкт. у 1927-28 г., 4.260.000 гэкт. у 1928-29 г. падыйшлі вясною гэтага году да 40 проц. ахопу калгасамі сялянскіх гаспадарак, што ў два разы перавышае намячэньне пяцігодкі (22.400.000 гэкт.),—дакладчык падрабязна аналізуе карэньні перагібаў, якія мелі месца ў сувязі з разьвіцьцём калгаснага будаўніцтва.

На радзе цытат з Леніна, з пастаноў парт'зьезду і пастаноў ЦК УсеКП(б) тав. Уншліхт поўнасьцю абвяргае цьверджаньне правых аб тым, што быццам сы партыя не дала ясных дырэктыў, ясных указаньняў аб палітыцы ў калгасным будаўніцтве, аб адносінах да серадняцкіх мас і аб тэмпах.

Памылкі ў галіне калгаснага будаўніцтва выкліканы былі, як гэта з поўнай выразнасьцю паказана тав. Сталіным, галавакружэньнем ад посьпехаў і, трэба проста сказаць, слабым вывучэньнем асноў ленінізму, кіруючых установак нашай партыі.

Відома, лягчэй рубіць з пляча, чым весьці сапраўды глыбокую арганізацыйную работу, улічваючы ўсю складанасьць абстаноўкі, падніманочы і ўцягваючы масы ў рух. Трэ' было пераканаць масы, трэ' было давесьці масам, што адзіны шлях, адзіная магчымасьць выхаду з убоства — гэта ўступіць у калектыўную гаспадарку. А замест гэтага ўжываліся мэтады націску, мэтады адміністраваньня. Ня ўлічваліся зусім сваяасаблівыя мясцовыя ўмовы.

Калі прарывы ў нас у галіне прамысловасьці тлумачацца ва многіх выпадках тым, што формы і мэтады кіраўніцтва на мясцох адставалі ад актыўнасьці, творчасьці і энтузіязму мас, дык у адносінах калектыўных гаспадарак мы павінны паставіць дыягназ проста процілеглы: мы часамі забягаем уперад мас, будуем паміма мас, прабуем адміністрацыйнымі мэтадамі выклікаць рэвалюцыйны ўздым сярод шырокіх мас.

Тавары шы на мясцох не зразумелі таго, што трэба правяраць аптымістычныя данясеньні з месц, правяраць самі х сябе. Толькі тады, калі Цэнтральны Камітэт партыі паслаў сваіх прадстаўнікоў на месцы, толькі тады перад намі паўстаў сапраўдны малюнак тых брыдот, якія рабіліся на мясцох. А там ішла пісаніна: ніжэйшыя даносілі вышэйшым, што ў нас усё добра, што ўсё на месцы і ў парадку, што калгасы растуць, як грыбы.

Выявілася таксама няўменьне скарыстаць, уцягнуць у справу калгаснага будаўніцтва беспартыйныя серадняцкія масы. Тут зноў праявілася вядомае «камчванства», пам усё ні па чым, мы ўсё можам і зробім самі — бяз мас.

Здавалася-б, што калі былі выяўлены гэтыя памылкі, калі Цэнтральны Камітэт ударыў па вінаватых, здавалася-б, што трэба сумленна і адкрыта аб гэтых памылках заявіць і іх выправіць. Але ў нас ёсьць катэгорыя работнікаў, якая яшчэ і зараз стараецца ўсякімі праўдамі і няпраўдамі вытлумачыць і апраўдаць створанае становішча, шукаць усюды вінаватых, выключаючы саміх сябе. Мелася пэўнае імкненьне зваліць адказнасьць на ЦК. Але дакументальныя даныя паказваюць на ўсю нядобрасумленнасьць і неўгрунтаванасьць такога роду абвінавачаньняў. Зараз створана новая тэорыя, тэорыя «пры ліваў і адліваў», якая выяўляецца ў тым, што, моў, у серадняка такая псыхалёгія, сёньня ён уваходзіць у калгас, а заўтра выходзіць з яго. Паводле гэтай тэорыі выходзіць, што нічога нечаканага ня здарылася, нічыёй віны няма, што ўсё тое, што было, зьяўляецца зусім нармальным і няўхільным.

У заключэньне гэтай часткі дакладу тав. Уншліхт зазначае на тое, што «левыя» загібшчыкі лілі ваду на млын правых, якія прабуюць скарыстаць дапушчаныя на мясцох памылкі для новай атакі на ЦК. Рукі кароткі, — кажа тав. Уншліхт, — рабочая кляса, уся партыя жорстка ўдарыць на тых, хто гадымаецца супроць генэральнай лініі, якая ажыцьцяўляецца ЦК партыі.

Правакацыя вайны супроць СССР і задачы абароны

У капіталістычным сьвеце і ў нас — два зусім процілеглыя малюнкі. Там — крызіс і развал. У нас — бесьперапынны і хуткі рост сацыялістычнай гаспадаркі. Посьпехі будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі выклікаюць энтузіязм сярод шырокіх мас пралетарыяту імпэрыялістычных краёў. Сусьветны капітал ставіць сабе задачу — ліквідаваць вогнішча сусьветнай рэвалюцыі, наш Савецкі Саюз. Нашы ворагі яўна імкнуцца справакаваць вайну, усклясьці на СССР адказнасьць за вайну. Аб гэтым сьведчаць падзеі на К.-У. чыгунцы. Але і гэта спроба сарвалася. Мы на правакацыі не паддамося. Савецкі ўрад вядзе і далей цьвёрдую палітыку міру, даючы руйнуючы адпор усякім спробам узброенага нападу на тэрыторыю нашага краю. Устанавіць час вайны немагчыма. Але ясна, што вайна ня толькі няўхільна, але і тое, што яна можа разыграцца ў недалёкім будучым. Ясна, што мы павінны быць заўсёды ў баявой гатоўнасьці.

Тав. Уншліхт падрабязна асьвятляе мэтады і прыёмы падрыхтоўкі вайны капіталістычнага сьвету супроць СССР і ў сувязі з гэтым спыняецца на праблеме мэханізацыі і матарызацыі арміі.

У радох Чырвонай арміі ёсьць таварышы, якія недаўлічваюць важнага значэньня мэханізацыі і матарызацыі РСЧА. Але ёсьць і процілеглы пункт погляду, які лічыць магчымым поўную замену коньніцы мэханізаванымі часьцямі. Гэты апошні пункт погляду ня ўлічвае канкрэтнай сваяасаблівасьці нашых тэатраў вайны, асаблівасьцяй будучай вайны, не разумее тактычнага назначэньня мэханізаваных злучэньняў. Іх асноўная задача — прарыў фронту, удар на тылох. Але без пяхоты посьпех іх атакі замацаваны і рэалізаваны быць ня можа. Мэханізаваныя злучэньні зусім не выключаюць неабходнасьці мець магутную коньніцу, якая, само сабою зразумела, павінна быць забясьпечана сучаснай зьвякінай.

На пытаньнях ваеннай тэхнікі дакладчык сканцэнтроўвае асаблівую ўвагу партканфэрэнцыі. Ён паказвае на посьпехі і дасягненьні Чырвонай арміі ў гэтым кірунку. Рэвваенсаветам праароблена вялікая праца па ажыцьцяўленьні сыстэмы ўзбраеньня РСЧА, па ўздыме і паляпшэньні навукова - пасьлядоўнай работы, па ўкараненьні новых узораў узбраеньня і мадэрнізацыі старых. У галіне абароны ад хэмічнага нападу мы значна пайшлі наперад. Растуць і ўмацоўваюцца авіяцыя і морскі флёт.

Тав. Уншліхт зварачае ўвагу дэлегатаў на выключную важнасьць задачы хаваньня і зьберажэньня зброі і задачы аўладаньня камскладам існуючай тэхнікай, павышэньня ўзроўню ваенна-тэхнічных ведаў і навыкаў.

Тав. Уншліхт на радзе лічбаў паказвае матар'яльна - гаспадарчы рост РСЧА.

Ваенныя апэрацыі на Далёкім Усходзе паказалі, што баявая падрыхтоўка Чырвонай арміі стаіць на належнай вышыні. Чырвонаармейцы праяўлялі высокія баявыя якасьці. Начклад паказаў што ўмее кіраваць баявымі апэрацыямі ў складанай абстаноўцы і трудных умовах.

Наогул палітыка - маральны стан РСЧА зьяўляецца ўстойлівым. Меліся і паяўнасьці праяўленьні актыўнасьці боку клясавага ворага, у сувязі з загатоўкамі збожжа, калгасным будаўніцтвам, у сувязі з ліквідацыяй кулацтва як клясы, перагібамі і памылкамі. Характэрна, што ўсім гэтым праяўленьням актыўнасьці клясавага ворага адпор давала сама чырвонаармейская маса.

Сацыяльны склад РСЧА бязупынна паляпшаецца. На 1 студзеня 1929 г. рабочых было 24,3 проц., на 1 студзеня 1930 г. — 26,9 проц. Процант рабочых сярод камскладу павысіўся за той-жа пэрыяд з 28,5 да 29,9 проц. Палова ўсяго камскладу РСЧА зьяўляецца партыйнай. Процант рабочых у прыёме 1928 г. у вайсковыя школы складаў 56, у 1929 г. — 66,2 проц. Курс на адзінаначальле цьвёрда праводзіцца ў жыцьцё. Пытаньне аб кадрах мае жыцьцёвае значэньне для Чырвонай арміі, і РВС у сувязі з гэтым быў ужыты рад мерапрыемстваў.

Тав. Уншліхт спыняецца далей на пытаньнях удзелу Чырвонай арміі ў сацыялістычным будаўніцтве, на значэньні калгасаў для ўмацаваньня абароназдольнасьці краю і па ролі савецкай грамадзкасьці ў справе абароны краю.

Палітычны рост Чырвонай арміі знайшоў сваё выяўленьне ў разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, якія ўсё глыбей прасякаюць у гушчу чырвонаармейскіх мас. Самакрытыка разгарнулася, але пакуль што ашчэ невыстарчальна.

Як колькасна, так і ў ідэалёгічных адносінах партарганізацыя РСЧА вырасла і ўмацавалася. Бальшавікі Чырвонай арміі здолелі даць адпор як апартуністычным хіснаньням, так і «левым» загібам.

Лічу, — заканчвае свой даклад тав Уншліхт, — што абстаноўка патрабуе ад нас ажыцьцяўленьня наступных асноўных задач: поўнага адзінства радоў Рабоча - Сялянскай Чырвонай арміі, падняцьця на належную вышыню дысцыпліны, выкаўкі сапраўдных камандзіраў - адзіначальнікаў, паглыбленьня ваенных і палітычных ведаў, ліквідацыі верхаглядзтва і камчванства, злучэньня тэорыі з практыкай, максымальнага ўзмацненьня баявой вучобы і яе тэмпаў, аўладаньня ўсё больш складанымі сродкамі і формамі вядзеньня бою, быць кожную мінуту ў поўнай баявой гатоўнасьці. На гэта я зварачаю асабліва вашу ўвагу. Лічу гэтае пытаньне цэнтральным і асноўным. Мы павінны вучыцца, паглыбляць вайсковыя веды, але памятаць — абстаноўка такая, што магчыма, у бліжэйшг час прыдзецца ваяваць.

Не на словах, а на справе вывучаць і праводзіць генэральную лінію нашай ленінскай партыі. Мала паўтараць: мы цалкам і поўнасьцю згодны з гэтай лініяй, трэба ўсьвядоміць увесь яе глыбокі зьмест, дзейсна ператвараць яе ў жыцьцё.

Абвясьціць бязьлітасную барацьбу «левым» загібам і правараму ўхілу, які ўсё ашчэ застаецца галоўнай небясьпекай.

Да выкананьня гэтых задач я заклікаю вас. Заклікаю не як намесьнік старшыні Рэвваенсавету, але як ваш стары партыйны таварыш, які шмат бачыў у сваім жыцьці і які разумее, што толькі адзінства нашых радоў, цьвёрдасьць і непахіснасьць у ажыцьцяўленьні ленінскай лініі нашай партыі зьяўляецца гарантыяй нашай перамогі.

Кастрычніцкая партканфэрэнцыя

Даклад тав. Тамашэўскага аб рабоце Менскага Акругкому КП(б)Б

Канфэрэнцыя заслухала даклад МЕНСКАГА АК КП(б)Б. Дакладчык т. ТАМАШЭЎСКІ адзначыў, што менская арганізацыя пад кіраўніцтвам акругкому вяла няпрымірымую барацьбу супроць усялякіх адхіленьняў ад лініі партыі. Акруговая партарганізацыя на чале з АК кяўхільна ўзмацняе барацьбу з правым ухілам — галоўнай небясьпекай і з «левым» апартунізмам, з рэштункамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму. — Мы рашуча ўдарылі, заявіў далей дакладчык, па тэорыі і практыцы бізларускага нацыянал-дэмакратызму. Разам з тым акругком бязьлітасна змагаўся і змагаецца з шавінізмам усіх копераў.

Пераходзячы да пытаньняў прамысловасьці і сельскае гаспадаркі т. Тамашэўскі падкрэсьліў, што апошнія гады адзначаны радам рашаючых дасягненьняў і посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва. Тэмпы росту нашай прамысловасьці далёка выперадзілі ўсе нашы плянавыя меркаваньні. За мінулыя паўтара гады ў нашай акрузе мы пабудавалі рад новых буйных заводаў і фабрык («КАСТРЫЧНІК», «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА», «БЕЛАРУСКА» і інш.).

Адзначаючы буйнейшыя посьпехі выкананьня прамфінпляну, т. Тамашэўскі завастрае ўвагу на прарывах, якія яшчэ маюць месца ў выкананьні плянавых заданьняў. Асабліва дакладчык падкрэсьлівае наяўнасьць сур'ёзных прарываў у выкананьні якасных паказальнікаў прамфінпляну. Завод «Бальшавік», напрыклад, ня выконвае заданьня па паляпшэньні якасьці прадукцыі. Ня зусім добра стаіць справа з выкананьнем прамфінпляну і на чыгунцы. Тав. Тамашэўскі рашуча завастрыў увагу на задачах зьніжэньня сабекошту. На гэтым вучастку мае месца сур'ёзны прарыў. Плян зьніжэньня сабекошту ня выкананы. Задача партыйнай арганізацыі заключаецца ў тым, каб разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва, мабілізуючы актыўнасьць рабочых мас, поўнасьцю ліквідаваць гаспадарчыя прарывы і дабіцца перавыкананьня якасных і колькасных паказальнікаў прамфінпляну. — Узмацняючы ўдарны рух, гаворыць дакладчык, мы павінны разгарнуць барацьбу з інжэнэрнымі ўхілам.

Потым т. Тамашэўскі перайшоў да пытаньняў калгаснага будаўніцтва. Ён падкрэсьліў, што мы дабіліся бясспрэчных посьпехаў у калгасным будаўніцтве. У Менскай акрузе звыш 20 проц. зямельнай плошчы калектывізавана. Гэта вялікае дасягненьне. Аднак, побач з гэтым, падкрэсьліў т. Тамашэўскі, у практыцы калгаснага будаўніцтва былі дапушчаны асобныя памылкі. Некаторыя раённыя арганізацыі займаліся адміністраваньнем, дапускалі антысерадняцкія перагібы і г. д., і г. д. Акругком партыі рашуча прызнаў і асудзіў дапушчаныя ім памылкі. АК мабілізаваў партыйную арганізацыю на хутчэйшую ліквідацыю памылак і перагібаў, дапушчаных у асобных раёнах.

У заключэньне т. Тамашэўскі выказаў цьвёрдую ўпэўненасьць, што менская арганізацыя, пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК, на аснове бальшавіцкай самакрытыкі выканае пастаўленыя перад ёю задачы па барацьбе на два франты, за прамфінплян, за калектывізацыю вёскі, за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

***

Па дакладзе акругкому выказалася 17 чалавек. Таварышы, якія выступалі ў спрачках, канстатавалі, што Менскі акругком партыі праводзіў правільную партыйную лінію. Трэба адзначыць, што прамоўцы закранулі ўсе асноўныя пытаньні работы Менскага АК КП(б)Б і акруговай партарганізацыі.

Тав. ЦЁМКІН паказаў, што дакладчык нічога не сказаў аб пытаньнях транспарту. На Кастрычніцкай канфэрэнцыі каля 30 проц. дэлегатаў зьяўляюцца чыгуначнікі. Тым больш дакладчык павінен быў аддаць пытаньням транспарту самую сур'ёзную ўвагу.

Транспарт да гэтага часу зьяўляецца вузкім месцам народнае гаспадаркі БССР. Вялікі цэнтралізм, які існаваў на чыгунцы, зьяўляўся аднэй з асноўных прычын адставаньня транспарту. Потым прамоўца гаворыць аб кадрах для транспарту. Тут ёсьць цэлы рад сур'ёзнейшых недахопаў.

Завод «КАМУНАР», «ЭНЭРГІЯ» і інш. пераманьваюць з транспарту кваліфікаваных рабочых. З прычыны адсутнасьці кваліфікаваных рабочых на транспарце, цягнікі ідуць часамі пад адкос. Таксама лепшых работнікаў чыгункі высоўваюць на іншыя галіны работы, ня ўлічваючы патрэб самога транспарту. Гэта трэба выправіць. Трэба ўзмацніць партыйнае кіраўніцтва на транспарце.

У парткалектывах і буйнейшых ячэйках створаны сэктары. Але гэта работа ў радзе месц праведзена мэханічна. Жывой работы сэктароў у сапраўднасьці няма. Як працаваў раней у асноўным адзін сакратар ячэйкі, так і зараз у цэлым радзе ячэек гэта становішча не зьмянілася.

Тав. АЛЬТМАН гаворыць, што многія адміністрацыйныя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі на прадпрыемствах яшчэ не зрабілі ўсяго магчымага для выкананьня прамфінпляну. Завод «Энэргія» атрымаў прамфінплян толькі ў сьнежні. Ня дзіва, што прарыў у выкананьні прамфінпляну быў выкрыты з вялікім спазьненьнем. Мы мала робім для таго, каб абменьвацца вопытам работы паміж заводамі і фабрыкамі. Будаўніцтва клюбаў, гаворыць далей тав. Альтман, праходзіць бяз вучоту запатрабаваньняў рабочых. Клюб мэталістых, напрыклад, які пабудаваны нядаўна, ня можа абслужыць усіх рабочых-мэталістых. Пры кожным прадпрыемстве, заявіў прамоўца, трэба абсталяваць добрыя чырвоныя куткі.

У апошні час ад ВСНГ і прафсаюзаў вельмі часта прыходзяць камісіі па абсьледваньні. Прыдуць, пагавораць і выходзяць. Такія абсьледваньні не даюць ніякай дапамогі ў рабоце на прадпрыемстве.

АК, гаворыць тав. Тамашэўскі, прызнаў свае памылкі ў кіраўніцтве калгасным будаўніцтвам і спасаваў свае асобныя няправільныя пастановы. Але гэта ня значыць, што асноўная палітычная лінія акруговага камітэту ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва была няправільная. Мы дабіліся, бясспрэчна, вялікіх посьпехаў у калектывізацыі сельскае гаспадаркі і іншых посьпехаў прамфінпляну і будаўніцтва. Трэба ўзмацніць кіраўніцтва гэтымі асноўнымі вучасткамі гаспадарчай работы. У заключэньні тав. Тамашэўскі гаварыў ашчэ аб радзе пытаньняў работы АК і Менскай партарганізацыі.

КАСТРЫЧНІЦКАЯ РАЁННАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ УХВАЛІЛА ПАЛІТЫЧНУЮ ЛІНІЮ МЕНСКАГА АК КП(б)Б І ПРЫЗНАЛА ЯГО РАБОТУ ЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ. Затым з дакладам аб рабоце АКК выступіў тав. ДАМБРОЎСКІ.

На партканфэрэнцыі БВА

Заключнае пасяджаньне

Учора раніцай былі заслуханы заключныя словы т. т. Ягорава і Араштама. На гэтым пасяджэньні са справаздачай аб рабоце акруговай партыйнай камісіі выступіў сакратар АПК тав. Унгур.

У спрэчках выказаліся т. т. Тамашунас, Калабаеў, Жукаў, Рузін, Рыхтэр

Перад закрыцьцем раніцняга пасяджэньня канфэрэнцыю віталі курсанты і камандзіры АБВШ і №-скі артполк. Ад імя канфэрэнцыі ім адказвалі т. т. Грыбаў і Крохмаль.

Пасьля дня працавалі камісіі па выпрацоўцы рэзалюцый па ўсіх дакладах.

На вячэрнім пасяджэньні было заслухана заключнае слова т. Унгура і зацьверджаліся рэзалюцыі па ўсіх дакладах.

Канфэрэнцыя абрала новы склад акруговай партыйнай камісіі ў ліку 53 асоб.

Перад закрыцьцем канфэрэнцыі выступіў намесьнік старшыні Рэвваенсавету СССР т. Уншліхт: «Работа канфэрэнцыі і спрачкі, якія разгарнуліся па асноўных дакладах, ашчэ больш пераканалі мяне ў тым, што актыў вырас і разумее, якую ўвагу трэба аддаць пытаньням нашай работы ў армейскіх умовах.

Вы атрымалі поўнае і яснае ўяўленьне аб задачах, якія стаяць перад намі, армейскімі камуністымі. Непасрэдна на мясцох працуйце так, каб улічыць усе выяўленыя недахопы і ліквідаваць усе нашы прарывы.

Рэвваенсавет Саюзу выказвае поўную ўпэўненасьць у тым, што акруга справіцца з тымі задачамі, якія стаяць перад ёю. З гэтай упэўненасьцю я ад'яжджаю з вашай канфэрэнцыі.

За баявую падрыхтоўку РСЧА. За ЦК УсеКП(б). За Рэвваенсавет Беларускай акругі.—Наша магутнае чырвонаармейскае ўра!

Гучнымі воклічамі «ўра» адказала канфэрэнцыя на заключнае слова тав. Уншліхта. Дэлегаты стоячы віталі тав. Уншліхта.

— Мы даўно так рэальна ня бачылі ваеннай небясьпекі, як у пачатку вясны бягучага году—гаворыць тов. Араштам. Правільная палітыка ЦК прывяла да таго, што мы атрымалі магчымасьць прадоўжыць перадышку і працягваць узмацненьне баяздольнасьці Чырвонай арміі. Але мы ведаем, што гэтая перадышка нядоўг

Ударнікі перамагаюць

Доўга будуць памятаць кадравікі заводу «Камунар» першыя дні параджэньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Перадавым рабочым прышлося тады правесьці вялікую барацьбу з групкай рабочоў, якія моцна трымаліся за свае

тав. АДУЦКЕВІЧ—токар-ударнік заводу «Камунар»

ізкія нормы і высокія расцэнкі. Гэтаму супраціў стары склад тарыфна-нарміравачнага бюро, які цягнуўся ў хвасьце ...тай групкі рвачоў. Ня гледзячы на ...е, што рабочы дзень ня быў ушчыльнены, што прыработак некаторых рабочых складаў больш асноўнай зарплаты, ...ТНВ на ўсё гэта глядзела скрозь пальцы. З такой пастаноўкай работы ТНВ ...ак нельга было згадзіцца.

Першыя зразумелі гэта камсамольцы ...ў адзін прыгожы дзень яны падалі заяву наступнага зьместу:

«Мы, рабочыя сьлесарнага цэху ...ольнасьці 10 чалавек, абвяшчаем сябе ...дарнікамі і абавязваемся зьнізіць расцэнкі на 10 проц., зьнішчыць прагулы ...а нягрунтоўных прычынах, абяцаем ...выпускаць бракаваных вырабаў і ...клікаем пасьледаваць нашаму прыкладу ўсіх рабочых».

А вечарам таго-жа дня ў заўкоме падсалі першы гаспадарча-палітычны даклад прадстаўнікі ўдарнай брыгады **т. Турэцкі, Пінскі і Ільпін.** Так пачалася на заводзе вялікі рух, які прывёў вод да раду вытворчых перамог.

Прыкладу першай брыгады пасьледалі рабочыя па выпуску кампядрабілак—т. т. **Голуб, Фішкін, Міцэльман і ...ндратовіч.**

— Да веснавой сяўбы трэба даць калгам ... кампядрабілак. Тэрмін здачы першага красавіка.

Такім быў загад адміністрацыі.

Часу засталося мала. Але ўдарнікі заводу «Камунар» дружна ўзяліся за работу. Была абвешчана бязьлітасная барацьба прагулам, марнаваньню часу, вытворчым неладам. **І гэта дало магчымасьць здаць заказ у тэрмін.** Першыя ударныя брыгады паказалі ўзорны прыклад камуністычнай працы.

Пасьля гэтага ў такарным цэху арганізавалася 5 вытворчых камун. Апрача ...ніжэньня расцэнак камунары пачалі ...номіць інструманты. Раней, напрыклад, на адным варштаце масавай ...ркі ціскоў працавала тры чалавекі і ...каму з іх быў патрэбен камплект ...струмантаў з дэфіцытнай самакальнай сталі. Цяпер гэтыя-ж тры чалавекі ...цуюць адным камплектам інструментаў. Эканоміцца час на запраўку ...струмантаў. **Прадукцыйнасьць працы ...увязі з гэтым паднялася на 20 проц., ...елішылася якасьць прадукцыі.**

Камунары вядуць вялікую работу ў ...ку сярод навічкоў, растлумачваючы ...ачы, якія стаяць перад заводам. А ...ба сказаць, што сярод навічкоў шмат ...іх, хто яшчэ ўчора прышоў з вёскі і ...нёс з сабою некаторыя адсталыя ...троі. І прапагандысцкая работа кагараў ужо дае сябе адчуваць. **Навічкі ...сама запісваюцца ва ўдарныя брыгады ...і імкнуцца працаваць так, як і старая рабочыя.**

Пастуц ударныя брыгады. **Бляшаны ...цэхам абвясьціў сябе ўдарным.** ...чалавек гэтага цэху абавязаліся ...ішчыць прагулы, палепшыць якасьць ...дукцыі, падняць прадукцыйнасьць ...цы на 60 проц., у параўнаньні з мінулым годам. **Ударнікі бляшанага цэху ...авыканалі свае абяцаньні, павялічылі** зразумеюць, што так адносіцца да сацыялістычнага прадпрыемства не да твару савецкаму рабочаму.

Цяжка было правяраць вынікі сацспаборніцтва і ўдарніцтва рабочым бры-

ЕРЫНГРОЗ — майстар-ударнік такарнага цэху заводу «Камунар»

гадам і часовай кантрольнай камісіі. Улік на заводзе быў вельмі кепска пастаўлен. Ніхто ня цікавіўся дасягненьнямі ўдарных брыгад у цэхах. Вытворчая камісія ў мінулым годзе працавала так, што нават рабочых прапаноў не фіксавала. Гэта вяло да таго, што ўдарнікі працавалі ўсьляпую.

Адміністрацыя да гэтага часу не зварачае ўвагі на прапановы рабочых. Адміністрацыя лічыць гэта зусім нармальным.

— Вось мы не адказваем на заметкі рабкораў, не рэагуем на прапановы рабочых, а прамфінплян усё-ж такі выконваем,—пахваляючыся, гаворыць дырэктар заводу т. Левін.

Ясна, што ў тав. Левіна наглядаецца **«галавакружэньне ад посьпехаў».** Яму толькі выконваць прамфінплян і больш яго нічога не датычыць. Між тым, калі-б былі сваячасовыя адказы на рабкораўскія заметкі і належнае рэагаваньне на рабочыя прапановы, можна было-б дабіцца ня толькі выкананьня прамфінплану, **але і значнага яго перавыкананьня.**

Ня трэба таксама забываць, што ўжо час пачаць падрыхтоўку да новага гаспадарчага году. А гэта значыць, што трэба правесьці рацыяналізатарскія мерапрыемствы для далейшага разьвіцьця заводу і далейшых посьпехаў. Нерэагаваньне на рабочыя прапановы можа ў далейшым вельмі адмоўна адбіцца ня толькі на разьвіцьці заводу, а нават на выкананьні прамфінплану.

А. МАНЬКОЎ.

Тав. БАРАНАЎ—ударнік заводу «Камунар»

КАМУНА НА БАЛОЦЕ

Чырвонаармейцы-камунары будуюць буйнейшую ў БССР калектыўную гаспадарку

Камуна імя БВА арганізавалася ўвосень 1929 г. на тэрыторыі Мар'інскага калфонду, дзе ня было ніякіх жыльлёвых і гаспадарчых будынкаў. Тэрыторыя камуны займае 3.400 гэкт., насельніцтва камуны складае 288 асоб, з іх членаў камуны—217.

У камуне пабудованы 3 жыльлёвыя памяшканьні на 48 пакояў, скотны двор на 200 кароў, паравы млын, стайня, агульная харчоўня, лазьня з пральняй, кухня, дзьве артэзіянскія студні.

Стада буйнай рагатай жывёлы налічваецца больш за 400 штук. Арганізавана (пакуль што у невялікіх разьмерах) масла-сыраварная вытворчасьць.

Цягавая сіла даволі значная—10 трактараў маркі «Інтэрнацыянал», 113 рабочых коняй. Рабочая сіла разьмеркавана ў выгляде брыгад па асобных галінах гаспадаркі. Арганізаваны брыгады возчыкаў, цесьляроў, трактарыстых, паляводаў, па абслугоўваньні скотнага двара, па быце. Рабочая сіла камуны скарыстоўваецца поўнасьцю.

Камуна карыстаецца добрым аўтарытэтам сярод наўкольнага батрацка-бяднякцкага насельніцтва. Пры актыўным удзеле камунараў арганізавана 5 калгасаў у акружаючых камуну вёсках (Кузьмічы, Нежын, Стара-Юркава, Мала-Гародзічы, Вялікія Гародзічы). Старшынямі 4-х з гэтых калгасаў зьяўляюцца камунары. Камунар таксама выбран старшынёю сельсавету.

Наглядаецца вялікае імкненьне ўступіць ў камуну. За апошнія некалькі месяцаў падана звыш 500 заяў аб прыёме ў камуну.

Сярод камунараў праводзіцца культурна-выхаваўчая работа. Абсталяваны ленінскі куток, у якім ёсьць газэты, часопісі, 2 радыё-прыёмнікі, бібліятэка ў 1.200 кніг, кіно-апарат. Арганізаваны драматычны і музычны гурткі. 2 разы ў месяц выходзіць пасьценгазэта. Поўнасьцю ліквідавана нянісьменнасьць сярод камунараў. Арганізаваны бытавыя ўстановы, якія вызваляюць жанчыну ад цяжкай хатняй работы—ясьлі на 30 дзяцей, пральня, грамадзкае харчаваньне.

Веснавая сяўба ў камуне праходзіць здавальняюча. Плян засеву—500 гэкт.—будзе выканан да 20 мая.

Але-ж разам з тым трэба адзначыць рад адмоўных бакоў і недахопаў у рабоце камуны. Галоўнае—тое, што ўвесну гэтага году ў камуне стварыліся кепскія аб'ектыўныя ўмовы, якія перашкаджаюць працы камуны і маюць уплыў на ўсю яе работу. Гэтыя аб'ектыўныя ўмовы наступныя: з прычыны адсутнасьці калійнай солі завозяцца карналіт і попел, прычым карналіту патрабуецца на тую-ж плошчу ў 6 раз больш, чым калійнай солі. Калі мець яшчэ на ўвазе зусім дрэнныя дарогі вакол камуны, дык лёгка будзе зразумець, колькі лішняга часу і рабочай сілы адбірае перавозка і ўнясеньне ў зямлю штучных угнаеньняў. У выніку гэтага мы маем некаторае скарачэньне вызначанага пляну вясновага засеву і невыкананьне плянаў гаспадарчага і жыльлёвага будаўніцтва (бо брыгада цесьляроў абярнулася ў брыгаду возчыкаў).

У кіраўніцтве камуны ёсьць няправільная думка аб тым, што далейшы рост камуны павінен ісьці выключна за лік сем'яў камунараў—былых чырвонаармейцаў—і таму ёсьць шмат выпадкаў адмаўленьня ў прыёме батракоў і беднякоў з наўкольнага насельніцтва. Такая замкнутасьць і абмежаванасьць камуны ў прынцыпе няправільная. Неабходна, на меры магчымасьці (жыльлёвыя і гаспадарчыя ўмовы) разам з далейшым ростам за лік дэмабілізаваных чырвонаармейцаў прымаць батрака-бядняцка-серадняцкія элемэнты з наўкольнага насельніцтва, захоўваючы пры гэтым пераважнасьць чырвонаармейскай часткі камуны.

Амаль зусім ня ўжываецца ў камуне мэтад сацыялістычнага спаборніцтва і стварэньня ўдарных брыгад. Заключаны паміж камунай і саўгасам імя 10-годзьдзя БССР дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве не правяраецца і ня выконваецца. Камуна павінна больш застосоўваць мэтад сацспаборніцтва ў вытворчасьці. Неабходна таксама ажывіць работу вытворчых нарад па брыгадах і пэрыядычна склікаць нарады ў маштабе ўсёй камуны.

Сьвіное стада знаходзіцца ў зусім дрэнных умовах. Адсутнічае сьвінарнік, няма належнага нагляду за буйнай рагатай жывёлай, улік у камуне да гэтага часу не паладжан. Многія гаспадарчыя аперацыі не запісваюцца.

КАГАНОВІЧ.

ВІЦЕБСКАЯ ГАРБАРНЯ ЗРЫВАЕ РАБОТУ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ

Адкрыты ліст рабочым штамповачнага цэху віцебскай гарбарні ад рабочых Менскай абутковай фабрыкі

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Становішча з забесьпячэньнем нашай фабрыкі поўфабрыкатамі пагражаючае. З ПРЫЧЫНЫ НЕСВАЯЧАСОВАЙ ПРЫСЫЛКІ ПОЎФАБРЫКАТАЎ МЫ МАЕМ ШТОДЗЕННЫЯ ПРАСТОІ.

Мы вам паслалі спэцыяльную адозву з падрабязным паказаньнем стану забесьпячэньня нашай фабрыкі вашым штамповачным цэхам. Мы таксама зьвярнуліся з лістом да вытворчай камісіі вашага цэху, але адказу няма, і мы ня ведаем, якія меры вамі ўхвалены.

15-га красавіка мы паслалі вам спэцыяльнага чалавека, з якім вы заключылі дагавор аб сваячасовай прысылцы поўфабрыкату па нарадах. АЛЕ ГЭТЫ ДАГАВОР ВАМІ НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА. 12, 13 і 14-га МАЯ МЫ МЕЛІ ПРАСТОІ З ПРЫЧЫНЫ НЕДАХВАТУ АБСАЦАЎ, ПАДЭШВЫ АДПАВЕДНЫХ НУМАРОЎ, ШТО ПРЫМУСІЛА ФАБРЫКУ ЗАМЕСТ 2.800 ПАР АБУТКУ Ў ДЗЕНЬ ВЫПУСЬЦІЦЬ 13-га МАЯ ТОЛЬКІ 2.486 ПАР І 14-га МАЯ ЎСЯГО 1.730 ПАР.

Мы накіравалі вам за гэтыя дні тры тэлеграмы, два разы гаварылі з дырэктарам вашага заводу т. Чыжам па тэлефону, а поўфабрыкатаў усё-ж няма. Таму мы зварачаемся да вас з просьбай—зрабіць уплыў на тых, хто затрымлівае прысылку нам поўфабрыкатаў.

Мы прымушаны паслаць да вас спэцыяльнага чалавека, які-б сачыў за сваячасовай і правільнай пасылкай нам поўфабрыкату, што бязумоўна павялічыць нашы накладныя выдаткі і будзе мець уплыў на зьніжэньне сабекошту.

ФАБКОМ, ДЫРЭКЦЫЯ, БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВУ. І ВЫТВОРЧЫ СЭКТАР МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ.

ПЯЦІГОДКА ЛЕСБЕЛУ--ЛІЧБЫ СА СТОЛІ

ПАМЫЛКІ ПЛЯНАВАНЬНЯ, ЯКІЯ МЯЖУЮЦЬ СА ШКОДНІЦТВАМ

„Пяцігодка" падзеньня лесапільнай прадукцыі.—Раду заводаў былі паменшаны заданьні па прадукцыйнасьці працы.--Павышэньне сабекошту замест зьніжэньня.--Скарачэньне пляну бачарнай вытворчасьці

Сацыялістычная рэканструкцыя нашай прамысловасьці, побач са зьмяненьнем матар'яльна-тэхнічнай базы яе, ставіць пытаньне аб рэарганізацыі сыстэмы кіраўніцтва ёю. Плянаваньне вытворчасьці набывае вельмі важнае значэньне. Гэта з дастатковай выразнасьцю знайшло сваё адлюстраваньне ў пастановах XVI партканфэрэнцыі аб рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасьцю і ў пастанове ЦК УсеКП(б) ад 5 сьнежня, якая ясна фармулявала кола работы трэстаў і аб'яднаньняў, а таксама становішча прадпрыемстваў, як самакіраўнічых адзінак. Трэсты і аб'яднаньні павінны абярнуцца ў органы плянаваньня і тэхнічнага кіраўніцтва.

Аднак, наўрад ці можна памыліцца, калі сказаць, што іменна пытаньні плянаваньня зьяўляюцца і былі найбольш «вузкім» месцам у рабоце Лесбелу. Можна без перавялічэньня сказаць, што фактычна плянаваньня, як такавога, ня было. Бо нельга назваць плянаваньнем складзеную Лесбелам пяцігодку, з абсалютным упадам прадукцыі па лесапільнай і інш. вытворчасьцях.

Ці зрабіў трэст палітычныя і практычныя вывады з гэтай, з дазволу сказаць, «пяцігодкі», якая перавышана ўжо жыцьцём у некалькі разоў. Не, не зрабіў. Бо **другая** пяцігодка, складзеная трэстам гэтымі днямі, і прытым складзеная за адзін дзень, не распрацоўвалася і не абмяркоўвалася на рабочых сходах, складзена паводле таго-ж прынцыпу «жашляваньня» лічбаў са столі. І ня дзіва, бо па чале плянавага аддзелу трэсту быў былы эсэр Фэльдман, чалавек абсалютна чужы і варожы пралетарыяту, які ня верыў у справу сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтаму вось чалавеку было даручана скласьці плян **сацыялістычнага наступленьня**—прамфінплян 1929-30 году. Натуральна, што ВСНГ плян гэты прыняў **умоўна,** а фактычна зацьверджанага пляну на 1929-30 год трэст **ня мае.**

Характэрныя адносіны групы спэцыялістых у трэсьце да пляну і да плянаваньня. Некаторыя з іх лічаць гэта данінай часу, неабходнай уступкай... адпаведным вышэйшым органам, ня вельмі абавязковай (асабліва ў частцы зьніжэньня сабекошту) для іх. Хіба-ж не абураючым зьяўляецца той факт, што **на бягучы год заводам былі даны заданьні па прадукцыйнасьці працы (завод «Камінтэрн», «Сацыялізм», імя Томскага і інш.) менш, чым у мінулым годзе?** Хіба-ж не абураючым зьяўляецца той факт, што Бабруйскаму камбінату дана заданьне па нагрузцы прэса-зьмены па фанэры амаль у два разы меншае магчымага.

Або возьмем бачарную вытворчасьць. Пры значным росьце ўжываньня тары для дэмэнту для нашага будаўніцтва, трэст чамусьці **скарачае** выраб клёпак у параўнаньні з мінулым годам на 500-600 тысяч камплектаў (з 2.200 тысяч да 1.650 тысяч камплектаў) пры заданьні ўраду ў 3.000.000 камплектаў. Як-жа магло здарыцца, што пры такім вострым голадзе на тарныя матар'ялы трэст згортвае гэту вытворчасьць, **закрывае** бачарныя цэхі на заводзе «Калектыўная Праца» ў Гомелі і ў іншых мясцох?

Трэба ўпэўнена сказаць, што пытаньні плянаваньня зьяўляюцца бяспрытульнымі ў трэсьце. Амаль ніхто ў трэсьце ня цікавіцца пытаньнем зьніжэньня сабекошту, ніхто не задумаўся над тым, чаму замест **зьніжэньня** сабекошту ў 1928-29 годзе мы маем **павышэньне** яго. Рэальнай дапамогі прадпрыемствам у патрэбнай меры не аказваецца, да апошняга часу яшчэ не пераведзены **на гаспадарчы разрахунак.** Загад вышэйшых органаў аб перавядзеньні прадпрыемстваў на сыстэму нарад-заказаў **ня выканан.**

Пытаньне разьвіцьця больш інтэнсыўных вытворчасьцяй, як мэбля і інш., у трэсьце слаба вывучана. Са значным спазьненьнем пастаўлена пытаньне аб поўнай рэканструкцыі лесапільнай вытворчасьці і парасілавай гаспадаркі. Сырцовая база трэсту зусім ня вывучана.

Пару слоў аб кіраўніцтве з боку ВСНГ. Можна сказаць, што віна за недахопы ў рабоце Лесбелу, аднаго з важнейшых аб'яднаньняў, падае і на ВСНГ. Кіраўніцтва ВСНГ са спазьненьнем паставіла пытаньні аб шляхох разьвіцьця лясной гаспадаркі БССР, не дало рэальнай дапамогі трэсту. ВСНГ у пэўнай ступені служыў толькі перадатачнай інстанцыяй, якая мэханічна перадавала дырэктывы саюзных органаў і штэмпэлявала матар'ялы трэсту.

Якія-ж нашы канкрэтныя прапановы па паляпшэньні плянавай работы трэсту?

1. Трэба карэнным чынам рэарганізаваць сыстэму плянавага кіраўніцтва трэсту, стварыўшы моцны плянавы аддзел, укамплектаваны выстарчальнай колькасьцю высока-кваліфікаваных спэцыялістых і партыйцаў.

2. Трэст павінен правільна паладзіць кіраўніцтва плянавым аддзелам з тым, каб усе асноўныя прынцыповыя пытаньні вырашаліся праўленьнем трэсту.

3. **Трэба неадкладна прыступіць да дэтальнай прапрацоўкі 5-цігадовага і пэрспэктыўнага пляну разьвіцьця Лесбелу, паставіўшы яго на абмеркаваньне грамадзкіх і партыйных арганізацый, заводаў і лесараёнаў.**

4. Неадкладна выправіць усе памылкі, дапушчаныя ў плянаваньні (напрыклад, па бачарнай вытворчасьці, заданьне па прадукцыйнасьці працы некаторым заводам і г. д.).

5. Прыступіць да дакладнага вывучэньня сырцовай базы трэсту і арганізацыі новых вытворчасьцяй (напрыклад, лесахэмічных), аб чым ужо ёсьць выстарчальныя ўказаньні аўтарытэтных органаў.

БРЫГАДЗІР.

(Факты, паданыя ў гэтым артыкуле, выяўлены камісіяй па чыстцы апарату Лесбелу пры ўдзеле рабочых брыгад)

Спаборнічаюць з сонцам

Як на гарбарні „Бальшавік" эканомяць энэргію

Рабочая Ляхаўка карыстаецца асаблівай любасьцю электрастанцыі. Аж да паловы 8-й гадзіны раніцы гараць на вуліцах вялікія электрычныя лямпкі, вядучы спаборніцтва з праменьнямі раньняга сонца.

Лішняя гадзіна электрычнага асьвятленьня вуліц прыносіць вялікія страты. Але хто павінен гэтым зацікавіцца?

Гарсавет, гаспадарнікі?

Не, цікавяцца толькі рабочыя Ляхаўкі, але на іх настойлівыя запытаньні ніхто не дае адказу.

Чаму-ж усё-ж такі ў сьветлы дзень гарыць яркае электрычнае сьвятло? Адказ адзін—дырэктыва партыі аб барацьбе са стратамі яшчэ не дайшла да сьвядомасьці адпаведных асоб.

Возьмем, напрыклад, гарбарню «Бальшавік». Тут ідзе ўпартае спаборніцтва з сонцам. Круглыя суткі тэрыторыя заводу асьвятляецца электрычнымі лямпамі. Ня лепшая справа і ўнутры заводу. У хромавым цэху ёсьць цёмны куток, дзе патрэбна сьвятло і днём. Але замест таго, каб запаліць адну лямпку, запальваецца 5-6. Нічога ня зробіш—такая ўстаноўка электра-манцёра **Самуйлава.** Тое самае наглядаецца і ў другіх цэхах.

Ня думае ніхто на гарбарні «Бальшавік» аб барацьбе са стратамі. Ёсьць шмат выпадкаў, калі пара выпускаецца ў паветра бяз усякай карысьці толькі з прычыны таго, што пара-вінцілі ня прыкручаны, як належыць. Або забываюць работы пасьля скансэньня работы зачыніць кран, і гарачая вада з вадаварак выліваецца ў канавы.

Затое досыць было качагарам абяцаць прэмію за эканомію апалу, як яны пачалі эканоміць пару, не даючы яе жэлтынаму і інш. цэхам. Ня важна, калі гэтым нагоршвалася якасьць прадукцыі.

Выразнага ўліку вылаткаваньня энэргіі на гарбарні няма. Па дыяграмах цэнтралатэхніка выходзіць, што гарбарня за паўгодзьдзе павінна была выдаткаваць 6.189,6 тон газавага вугалю на суму ў 154.740 руб., а фактычна быццам-бы выдаткавана 4.000 тон вугалю на 100.000 руб. Такім чынам, выходзіць, што з'эканомлена на апале звыш 50.000 руб. Паверыць у рэальнасьць паказаных лічбаў можна было-б у тым выпадку, калі-б на гарбарні на належнай вышыні знаходзілася пара-сілавая гаспадарка.

Але гэтага няма, і таму думка рабочых такая, што лічбы выдаткаваньня апалу ўзяты са столі, што плян выдаткаваньня апалу надта перавышаны і таму лічбы фактычнага выдаткаваньня апалу зьяўляюцца няправільнымі.

Гэтую-ж думку падтрымлівае нават і адміністрацыя. На пытаньне ці рэальны лічбы выдаткаваньня апалу намесьнік дырэктара т. Бандарчык адказаў:

— Ня веру я гэтым лічбам, ня вер і ты.

Да гэтага часу на гарбарні ня цікавяцца пытаньнямі рацыянальнага скарыстаньня пара-сілавай гаспадаркі.

Пры такіх адносінах адміністрацыі і заводзкіх арганізацый думаць аб рашучай барацьбе са стратамі ня прыходзіцца. Таму і сьвятло гарыць цэлы дзень, таму і трансмісіі круцяцца, калі машыны стаяць, таму і матар'ялы на сотні рублёў выдаткоўваюцца без карысьці...

Рабочаму калектыву і заводзкім арганізацыям трэба, нарэшце, усьвядоміць, якую шкоду дзяржаве прыносіць нерацыянальнае скарыстаньне энэргіі і матар'ялу.

А. М.

Аб аднэй „спробе аўтабіяграфіі" *)

...перш раз прачытаў «Мою жизнь» ...немцку — і быў пераконан, што таму рэчы можна пісаць з усёю адкрытасьцю і без камэнтараў толькі для заснага, прытым **буржуазнага** чытача. ...т, вядома, усё гэта праглыне і не ...рхнецца. «Кулак» для нямецкага ...ржуа ёсьць самы запраўскі «бядак» ...ага вы яшчэ хочаце. Буржуа сам ...ямі, седзячы ў сваім пакоі на 12 ...зін засаб, і сябе, вядома, лічыць ...дяком». Але для каго прызначан ...йскі тэкст, дзе ўсё гэта адноўлена ...ара ў літару. Няўжо для тых работ, абурэньне якіх супроць ЦК Троцкі ...бавеў распаліць запэўніваньнямі, што ...тых трымае «куро на кулака», і ...к ён запрашаў «павярнуць агонь на ...ва — супроць кулака, нэпмана і бюрата».

...ацька Троцкага быў тыповым буйным кулаком ужо ў пэрыяд дзяцінства ...учага аўтара «Моей жизни». Гэта ...зусім не бядак - зямляроб, а вясны эксплёататар, аб прыёмах якога ...ат яго сын не знаходзіць сказаць ніта лепшага за тое, што ён быў эксплёататарам **ня горшым** за другіх тэй... народы. Вось як апісвае Троцкі ...цьцё рабочых свайго бацькі:

«Жыльлём служыла чыстае поле, ...дажджыстую пагоду — стагі. На ...бед — посныя буракі і каша, на вя...эру — прасяныя крупнік. Мяса не давалі зусім, тлушчы выдаваліся толькі расьлінныя і ў нязначнай колькасьці. На гэтай глебе часамі пачыналася абурэньне. Рабочыя кідалі ...каць, зьбіраліся ў дварэ, лажыліся ў ...цень ля сьвірнаў жыватамі ўніз, заізіралі ў верх босыя, патрэсканыя, ...пакалатыя саломай ногі і чакалі. Ім ...давалі кіслага малака або гарбузоў, ці ...ніцы мяшка тараноў (сушанай воблы), ...ны зноў ішлі на работу, часта са ...ьлёвамі. Так было ва ўсіх маёнтках... Адным летам прышлыя рабочыя напавал захваравалі на курыную сьлепату. Увечары яны ледзь перасоўвалі ...ногі, выставіўшы ўперад рукі. Быўшы ...ў госьцях у вёсцы пляменьнік маткі ...М., аб якім мы пазьней даведаліся, ...што гэта быў умеркаваны лібэрал з ...ёгкім налётам народніцкага сацыя...ізму, — далёка не які-небудзь рэ...алюцыянэр. — **М. П.**) напісаў аб гэ...ым карэспандэнцыю, якую заўважы...і ў земстве і прыслалі інспэктара. На ...карэспандэнта», якога вельмі любілі, бацька і маці былі ў крыўдзе. Ды ён і сам быў ня рад (!). Ніякіх няпрыемных вынікаў, аднак, ня было (!!): інспэкцыя ўстанавіла, што хвароба здарылася ад нястачы тлушчаў, што пашырана яна па ўсёй губэрні, бо ўсюды корміць адноўлка, а дзе-підзе і горш» (т. І, 42-43, аб «карэспандэнце» гл.: 59-60 і 112. Ён сам... стаў буйным прадпрыемцам - выдаўцом).

Яшчэ і яшчэ раз: дзеля чаго і для каго ўсё гэта пішацца. Хацеў чалавек замазаць, што яго бацька быў эксплёататар, трэба было проста замаўчаць усе гэтыя факты (мы далей убачым, што Троцкі ўмее замоўчваць і больш важнае) Хацеў адкрыта расказаць, адкуль вышаў — нахвальная пчырасьць, але тады трэба было даць фактам ацэнку, якую ім даў-бы ўсякі бальшавік, хаця-б архіправы, а ня то што «левы». Даць-жа з усёй нявінаньсьцю **ўсе факты,** а потым замазваць іх **словамі** «зямляробчая праца» і да таго падобнае, аж да таго, што ад земскай інспэкцыі эксплёататару «ніяких няпрыемных вынікаў ня было» (гэта-ж на-боску!), — воля ваша, гэта чалавек ад пяра залежыць, а не пяро ад чалавека. Гэта зноў «бесьсьвядомае», зноў «натхненьне». Ня стрымаўся чалавек ад таго, каб напісаць яркі малюнак, а што ён калісьці в трубуны выгукваў: «Супроць кулака!» Агонь «направа!» пра тое — забыў. Гэта-ж з другое скрынкі «бесьсьвядомага». Каб зьвязаць гэтыя факты, патрэба была іменна сьвядомасьць — элемэнтарная сьвядомасьць, праўда, але нават яе не знайшлося...

Але калі ад бесьсьвядомага была пчырасьць, то замазваючыя салодкія слоўкі аб «працоўным жыцьці» гэта ўжо не натхненьне. Гэта ўжо наўдалыя, праўда, —спробы «падпарадкаваць выпадковасьці штучнаму адбору». Чым далей, тым гэтых спроб больш. Пад канец «адбор» становіцца настолькі «штучным», што ад «выпадковасьцяй» — ад гістарычнай рэчаіснасьці — ужо нічога не застаецца. Але перш чым перайсьці да гэтага роду ўзорыкаў прылажэньня гістарычнага мэтаду, трэба спыніцца яшчэ на даным эпізодзе дзяцінства аўтара, — добра што і сам аўтар надае гэтаму эпізоду свайго роду гістарычнае значэньне.

Справа ўжо ня ў вёсцы, у Янаўцы, а ў горадзе, у Адэсе. Троцкі ўжо вучань рэальнай школы. Цаца - хлопчык—заўсёды пацёркі, за рускія працы нават пяцёркі з плюсам.

«У школу я зьяўляўся акуратна, ранец мой быў у парадку, і вучнёўскі білет упэўнена знаходзіўся ў левай кішэні куртки» «Быў бяспрэчным першым вучнем, па вялікай адлегласьці ад другога».

Начальства, вядома, лічыла лепшым. І раптам такі казус. Быў у іх вельмі непапулярны настаўнік французкай мовы, з хранічным катарам жывата, і адпаведным, малапрыемным характарам. Рэалістыя яго ненавідзелі і падстройвалі яму ўсякія «штучкі». Аднаго разу, калі ён разглядваў клясу несправядліва пастаўленай камусьці «единицей», «зрабілі яму канцэрт», зашушукаліся шкодлівыя, перамігваючыся і падштурхоўваючы адзін аднаго локцямі, — я — гаворыць Троцкі, — быў у іх ліку не на апошнім месцы, магчыма, нават на першым». Проста кажучы, быў арганізатарам усёй справы.

«Канцэрт» быў дан, дзесяць - пятнаццаць вучняў засталіся «без абеду», а Троцкі па другі дзень ужо пасьпеў «напалову забыць аб учарашнай гісторыі». Начальства было, вядома, за тысячы вёрст ад якіх-небудзь падазрэньняў конт першага вучня. Як раптам арганізаваны Троцкім таварышы сьцямілі: «Мы сядзімо без абеду, а ён? Ён-жа ўсю справу ўсчаў!» І адзін за другім пачалі даваць начальству «шчырыя паказаньні». Начальства спачатку не давала веры, але калі «дзесяць-дванаццаць» хлапцоў пацьвердзілі паказаньні першага, давер'е ашуканага начальніка зьмянілася лютасьцю. «А, ён нас за нос увесь час вадзіў!». І Троцкага, ня зусім у прапорцыі з учыненым, — але ў належнай прапорцыі з лютасьцю аказаўшагася ў дурацкім каўпаку начальства —выключылі са школы (на год — потым ён скончыў курс без далейшых прыгод).

«Такое было першае, у сваім родзе палітычнае, выпрабаваньне. Групоўкі, якія злажыліся наўкола гэтага эпізоду: наклённікі і заіздросьнікі на адным полюсе, адкрытыя, адважныя хлапцы — на другім, і нэйтральная, зыбкая, няўстойлівая маса — пасярэдзіне, гэтыя тры групоўкі далёка няпоўнасьцю рассмакталіся і ў працягу наступных гадоў. У далейшым сваім жыцьці я сустракаў іх ня раз у самых разных умовах» (т. І, 94; увесь эпізод гл. там-жа, стар. 87 і наст.).

Сапраўды, калі нам прыдзецца знаёміцца «паводле Троцкага» з дыскусіяй 1923 году, мы ўбачым той-жа малюнак: галоўны арганізатар зусім у баку — ён ні прычым, яго справа зусім нават і не датычыць! — «адкрытых, адважных хлапчукоў», якія за гэтага сядзеўшага ў кустох правадыра «ратоборствуют», пішуць рэзалюцыі, зьбіраюць подпісы, выступаюць на сходах; нарэшце, «зыбкую, спачатку, пакуль не разабраліся, няўстойлівую масу», хісцкую, потым дружна наваротную да «наклёпнікаў і заіздросьнікаў», на баку якіх нечакана аказваецца ўся партыя за выключэньнем «адважных хлапцоў», пакрысе губляючых у такой абстаноўцы сваю адвагу і, з некаторым спазьненьнем, рухаючых сьледам за масай. Вельмі падобны малюнак — і недарма Троцкі ня раз яго ўспамінае, толькі не заўсёды з належнага поваду (гл., напр., т. II, 142). З поваду дыскусіі 1923 г. яна, чамусьці, яму не ўспаміналася.

Але дыскусія 1923 году, як яна намалявана ў «Моей жизни», гэта пэрл усёй кнігі. Раней гэтага заключнага акорду мы маем цэлы рад узорыкаў «штучнага адбору». Іх трэба будзе якой-небудзь з нашых устаноў (Інстытуту Леніна, напрыклад, або гісторыка - партыйнаму аддзяленьню ІКП) разабраць разьдзел за разьдзелам, з крыніцамі пад рукамі. Калі не для нашай партыйнай, то для заграніччай публікі гэта будзе вельмі патрэбная праца «Mein Leben» па-нямецку па маіх вачох расхватвалася. Тут для такога крапатлівага аналізу няма ні месца, ні, строга гаворачы, неабходнасьці. Я таму на адным прыкладзе папрабую разабраць толькі **мэтад** нашага аўтабіёграфа. На падставе гэтага ўзорыку можна меркаваць аб мэтадзе, якім напісана ўся кніга.

Эпізод, які я выбіраю, — вядомы «жнівеньскі блёк» 1912 году. Паводле выкладу «Моей жизни», гэта была зусім нявінная і ў поўнай меры бальшавіцкая рэч. «Я зрабіў спробу склікаць аб'яднаўчую канфэрэнцыю з прадстаўнікоў усіх сацыял - дэмакратычных фракцый». Спробе гэтай спачувала Роза Люксэмбург. «Аднак, Ленін паўстаў супроць аб'яднаньня з усёй сілай». Дзеля таго, што лейтматывам усёй кнігі зьяўляецца, што Ленін быў прыядзь і настаўнік аўтара («ён быў маім настаўнікам. Гэта ня значыць, што я паўтараў са спазьненьнем яго словы і гэсты. Але я вучыўся ў яго самастойна прыходзіць да тых рашэньняў, да якіх прыходзіў ён» т. II, стар. 123), дзеля таго, што гэта, відавочна, быў лепшы з вучняў, то, зразумела, Ленін іменна яго меркаваў у свае пераемнікі: «бяспрэчная мэта тактамэнту: аблягчыць мне кіраўнічую работу» (там-жа, стар. 217), і гэтае палажэньне абавязвае, то зараз-жа дадаецца: «Увесь далейшы ход падзей паказаў, што Ленін меў рацыю». Але ніякай асаблівай віны і за Троцкім ня было: «Гісторыя змаганьня бальшавікоў з меншавікамі ёсьць у той-жа час гісторыя бязупынных аб'яднаўчых спроб» (гл., усё гэта ў т. І, стар. 256—258).

Маючы на ўвазе, як відаць, «навічкоў і невукаў» — у якім вобразе прадстаўляецца Троцкаму сучасны партыйны чытач, — «аўтабіёграф» скромна замоўчвае, з кім прабаваў ня раз аб'яднацца Ленін — і з **нім** сапраўды аб'яднаўся ў 1912 годзе Троцкі. Але ў нас ёсьць на гэты прадмет зусім пэўныя выказваньні таго, каго і Троцкі — дваліца, як ужо ўспаміналася — прызнае найвялікшым аўтарытэтам. Ленін вельмі часта і вельмі дэтальна закранаў пытаньне аб жнівеньскім блёку і аб ролі Троцкага ў гэтай справе. Прыслухаемся да таго, што гаварыў «настаўнік» аб «вучню».

Яшчэ ў красавіку 1912 г., за паўгода да канфэрэнцыі, аб якой гаварыў Троцкі, Ленін — ня сам аб сабе, а на падставе слоў Плеханава — прышоў да вываду, што «канфэрэнцыя склікаецца «ліквідатарамі». «Ліквідатарскі характар скліканай АК канфэрэнцыі ўстаноўлен Плеханавым з неабвержнай яснасьцю». «Хто-ж застаўся?»—пытае Ленін, указаўшы, што ў сувязі з адкрыцьцём Плеханава бальшавікі - прымірэнцы выступілі суп

Агляд грамадзкага харчаваньня

Абсталяваньне для фабрык-кухань і сталовых

можа і павінна вырабляцца ў БССР

У ВСНГБ на пытаньне, што яны мяркуюць зрабіць, каб забясьпечыць сетку грамадзкага харчаваньня адпаведным абсталяваньнем, адказалі «мы гэтай справай займацца ня можам і ня будзем—у нас на Беларусі такое вытворчасьці арганізаваць не прадугледжана». У такім-жа прыкладна сэнсе ВСНГ адказаў на заяўку Белкаапсаюзу. Белкаапсаюзу адказалі проста—«мы лічым немагчымым вырабляць абсталяваньне для сталовых у БССР». Паперка гэта падпісаная т. т. Стракоўскім і Кэганам, была прышпілена да справы, і на гэтым перагаворы з ВСНГ спыніліся.

Такі самы адказ быў даны Белмэталяаб'яднаньнем. Праўда, там заявілі, што нічога немагчымага няма, але рабіць напрыклад, тэрмасы ў нас у Беларусі няма нішкага сэнсу.

Скліканая гэтымі днямі рэдакцыяй газэты «Савецкая Беларусь» разам з цэнтральнай камісіяй па абгляде грамадзкага харчаваньня, нарада (з удзелам прадстаўнікоў зацікаўленых устаноў) выявіла зусім іншы малюнак. Прадстаўнік Мэталяаб'яднаньня заявіў наступнае—«мы прыступаем да вырабу абсталяваньня для фабрык - кухань і сталовых. Мы будзем рабіць мясарубкі, хлебарэзкі, бульбачысткі, кухонныя пліты, рамы для пліт, катлы і тэрмасы. Для гэтага будуць прыстасаваны менскія чыгуначныя майстэрні, а на заводзе «Камунар» будуць вырабляцца тэрмасы, але... усё гэта будзе ў наступным годзе».

Нарада засыпала прадстаўніка Белмэталяаб'яднаньня пытаньнямі — «чаму гэта так, чаму ў наступным годзе?».

Аказваецца, усе залежыць ад праектаваньня машын і абсталяваньня для майстэрань. Паўгода патрэбна на адымак чарцяжоў, некалькі месяцаў на арганізацыю вытворчасьці, некалькі месяцаў наогул...

Ці можна паскорыць выраб гэтага абсталяваньня? Нарада выявіла, што пры мабілізацыі спэцыялістых гэты тэрмін можна паскорыць. Чарцяжы ня трэба рабіць нанава, а зьнімаць з тых машын, якія ўжо ўстаноўлены ў СССР.

На нарадзе начальнік вагонна-рамонтных майстэрань чыгункі заявіў, што майстэрні на якіх ВСНГ мяркуе арганізаваць гэту вытворчасьць, да гэтага часу яшчэ знаходзяцца паміж небам і зямлёй. Чыгунцы гэтыя майстэрні не падпарадкаваны, а ВСНГБ майстэрань яшчэ ня прыняў, і, калі перадача ня будзе паскорана, яны ня здолеюць падрыхтавацца да пераходу на новую работу.

Цікава, што прадстаўнік ВСНГ на гэтай нарадзе выступіў з прамовай, у якой адчувалася жаданьне перанесьці ўвесь центр цяжкасьці на «аб'ектыўныя ўмовы». Але скончыў прадстаўнік ВСНГ сваю прамову наступнай заявай: «трэба прапанаваць ВСНГ прыняць тэрміновыя меры да прыстасаваньня майстэрань і заводу «Камунар» да вырабу абсталяваньня для сталовых. Трэба ВСНГ падштурхнуць на гэту справу». Гэта паказвае, што пад уплывам грамадзкасьці ВСНГ зьмяніў свой погляд на магчымасьць вырабу такога абсталяваньня.

На нарадзе было вылічана, што сярод новых заводаў на вырабе абсталяваньня для сталовых у СССР адзін завод запраектаваны ў Беларусі. Гэта ўжо гаворыць за тое, што ВСНГБ ляпчэй будзе вырашыць гэтае пытаньне, што забесьпячэньне сырцом і самавытворчасьць будуць вырашацца шмат хутчэй.

На нарадзе праводзіліся канкрэтныя фактары, ілюструючыя дрэннае становішча з грамадзкім харчаваньнем на нашых фабрыках, заводах, у саўгасах і г. д. Будаўніцтва сталовых на некаторых прадпрыемствах цягнецца гадамі. З 26 сталовых, якія будуюцца ў Менску, абсталяваньнем забясьпечаны толькі 8. Прыгарадны саўгас МЦРК з 200.000 гэкт. зямлі ня можа працаваць, як след, толькі таму, што рабочыя ўцякаюць—няма сталовых.

Зусім дрэнна з грамадзкім харчаваньнем у калгасах. Прадстаўнік калгасцэнтру да гэтай нарады не падрыхтаваўся. Ён, акрамя нерэлічэньня сьпісу калгасаў, нічога ня мог сказаць, што патрабуецца для сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, які разьмер грамадзкага харчаваньня патрабуецца пасьля ўборкі ўраджаю, як і чым будуць абсталёўвацца сталовыя. Прадстаўнік Калгасцэнтру спасылаўся на Белкаапсаюз—«ён забясьпечыць», знаходзячы, што грамадзкім харчаваньнем у калгасах павінен займацца выключна Белкаапсаюз, а Калгасцэнтру гэта не датычыць. Па такіх настроях трэба з усёй сілай ударыць і дабіцца, каб Белкалгасцэнтр пытаньне грамадзкага харчаваньня ў калгасах лічыў сваёй роднай справай.

На нарадзе было высунута пытаньне, узьнятае газ. «Праўда», аб вырабе катлоў не з дэфіцытнай медзі, а з жалеза.

Некалькі слоў аб катлох і паходнай кухні. Гэта вытворчасьць, па катэгарычнай заяве ВСНГ, у нас на Беларусі ня будзе арганізавана. Трэба над гэтым пытаньнем задумацца. Патрэба ў такіх паходных кухнях ёсьць. Яна ўзрастае, і нельга гэтае пытаньне пакінуць без вырашэньня.

Нарада таксама выявіла неабходнасьць у арганізацыі рамонтных майстэрань для абсталяваньня існуючых сталовых. Вельмі часта які-небудзь дробны рамонт выводзіць са строю машыну, і гэтым самым пагоршваецца якасьць грамадзкага харчаваньня. Белрабсэкцыя павінна зараз-жа распачаць работу па арганізацыі гэтых майстэрань.

Нарада ў асноўным выказалася за наступнае: 1) паскорыць перадачу чыгуначных майстэрань, перабудову і прыстасаваньне іх для вырабу неабходнага абсталяваньня для сталовых 2) мабілізаваць сілы спэцыялістых на паскарэньне праектаваньня гэтага абсталяваньня і 3) друк і грамадзкасьць павінны сыстэматычна правяраць ход работы ў напрамку арганізацыі абсталяваньня для прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня.

Цэнтральны Дом Селяніна—у бясьпрытульным стане

Цэнтральны Дом Селяніна знаходзіцца ў нездавальняючым стане. Інтэрнаты для сялян-хадакоў звужаны, узімку па 50-60 чалавек начавала на падлозе ў калідорах. Частка сялян прымушана начаваць у прыватнікаў і карыстацца падпольнай адвакатурай.

ЦДС знаходзіцца ў антысанітарным стане. Лазьня не абсталявана, ёсьць кланы. На ўсё гэта органы аховы здароўя зусім не зварачалі ўвагі.

Культпраца сярод сялян-хадакоў праводзіцца зусім слаба, 6 месяцаў зусім адсутнічала агра - культпраца. Сельска-гаспадарчы музэй не ўкамплектаваны экспанатамі калгасаў і саўгасаў.

Няма кіраўніцтва Домам Селяніна як з боку НКЗ і НКА, так і гарсавету.

Прэзыдыум АВК, нарэшце, зьвярнуў увагу на гэтае становішча і прапанаваў загадчыку ЦДС для лепшага культурнага і палітычнага абслугоўваньня сялян - хадакоў склікаць нараду прадстаўнікоў адпаведных арганізацый, паладзіць вечары змычкі сялян з рабочымі прыгарадных калгасаў і саўгасаў, вызначыць 42 пакоі над інтэрнатам і г. д.

Пастаноўдена пабудаваць пры ЦДС дэзынфэкцыйную камэру, пральню і лазьню, а таксама правесьці каналізацыю да ЦДС.

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі



ЗЬЮР ЖНЯРКІ Ў КАЛГАСЕ «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ» (КЛІМАЎШЧЫНА)

Пуск каналізацыі ў Менску

Учора, а 2-й гадзіне дня, у Менску адбыўся ўрачысты пуск каналізацыі.

Вялікая роля каналізацыі ў сэнсе аздараўленьня санітарнага становішча гораду — ачышчэньне яго ад адкідаў і нячыстот, якія заражаюць паветра і гэтым робяць уплыў на здароўе насельніцтва. Такім чынам, пабудова каналізацыі цесна зьвязана з паленшаньнем добрабыту гораду.

З вялікім спазьненьнем каналізацыя пачала ў нас працаваць. Пасьля сканчэньня пракладкі трубаправодаў, уключэньня ў сетку каналізацыі некаторых буйных прадпрыемстваў і дамоў гораду, падрыхтоўкі фільтрацыйных палёў — была скончана пабудова насоснае станцыі — сэрца каналізацыі — і яна зараз пушчана ў ход.

У сетку каналізацыі ў даны момант уключаны ўжо 30 буйных дамоў гораду, малочны завод, хлебазавод, інстытут фізычных мэтадаў лячэньня, унівэрсытэцкі гарадок, пэрвовая клініка, спраўдом і 70-цікватэрны дом.

У бліжэйшым часе маецца на мэце ўключыць у сетку каналізацыі яшчэ 125 дамоў, фармзавод, заводы «Энэргія», «Бальшавік», «Чырвоная Зара», 1-ю савецкую гасьцініцу, гасьцініцу быв. «Эўропа», пасажырскі вакзал МБВ чыгункі і інш.

Сыстэма працы каналізацыі наступная: з усіх магістраляй гораду розны бруд паступае ў цэнтральны рэзэрвуар помпавае станцыі, дзе ён сартуецца — вадкі ідзе ў станцыю, а цьвёрды на падводах звозіцца за горад.

Помпавая станцыя абсталявана 2-мя цэнтрабежнымі помпамі з прапускчальнаю здольнасьцю ў 160 кубічных мэтраў вадкасьці ў гадзіну кожная. Для выпампоўваньня паветра з помпаў і трубаправодаў на станцыі маецца вакумпомпа, і для запісу колькасьці прапушчаных вадкасьцяй — спэцыяльна выпісаны з Нямеччыны вымяральны апарат «Вэнтуры».

Са станцыі вадкасьці і бруд па трубаводах паступаюць на фільтрацыйныя палі, якія знаходзяцца ў Шэйнічах (4 клм. ад гораду). Гэтыя палі займаюць 27 гэкт. Служаць яны спэцыяльна для наглынаньня вадкасьцяй (адкідаў).

На выпадак папсаваньня помпавае станцыі ад цэнтральнага рэзэрвуару станцыі ў раку Сьвіслач праведзены спэцыяльны трубапровод для натуральнага стоку адкідаў.

З учарашняга дня каналізацыя прыступіла да сталай працы.

А. МІРОНАЎ.

Да акруговых канфэрэнцый Азету

У рабоце арганізацый Азету заўважваецца за апошні час вялікі ўздым. Арганізацыі прыступілі да зьнішчэньня дапушчаных недахопаў у рабоце Азету.

Камуністычная фракцыя і лютаўскі пленум Беларускага Азету, на аснове генэральнай лініі партыі вызначылі ряд практычных задач для арганізацый Азету, асудзіўшы выкрытыя правы ўхіл і нацыянальны апартунізм у рабоце Азету.

У маі і чэрвені Беларускі Азет правядзе ў БССР акруговыя канфэрэнцыі Азету. У парадку дня стаяць вельмі важныя пытаньні, якія змогуць быць вырашаны толькі пры актыўным удзеле шырокіх працоўных мас. Мы падыходзім да акруговых канфэрэнцый з дасягненьнямі. Паленшыўся і павялічыўся склад членаў Азету. Мы маем таксама дасягненьні ў галіне інтэрнацыяналізацыі азетаўскіх арганізацый.

Нядрэнна мы правялі другую азетлётарэю. Усе акруговыя аддзяленьні амаль поўнасьцю пакрылі даўгі за лётарэйныя білеты, праведзена вялікая работа на калфондах БССР.

Трэба, аднак, адзначыць, што азетаўскія арганізацыі ня выканалі ўсіх сваіх магчымасьцяй, якія партыя і савецкая ўлада далі для ўцягненьня ў вытворчасьць працоўных яўрэяў. Праца азетаўскіх арганізацый ня ўключана ў агульныя тэмпы работы.

Да акруговых канфэрэнцый Азету трэба разгарнуць узмоцненую растлумачальную работу, каб азнаёміць працоўных з работай Азету. На мясцох павінны быць арганізаваны рабоыя брыгады для абсьледваньня добрых і кепскіх бакоў работы Азету.

Падрыхтоўка да акруговых канфэрэнцый і самыя канфэрэнцыі дапамогуць выкрыць пры актыўным удзеле працоўных мас, добрыя і дрэнныя моманты нашай работы і вызначыць шляхі далейшай працы.

КАЖДАН.

ЗА ДЗЕНЬ

З 1 чэрвеня ў Менску адкрываюцца 6-тыднёвыя курсы па перападрыхтоўцы 100 настаўнікаў.

***

Менскім акруговым вайсковым камісарам замест т. Місьнікава назначан тав. Старакошка.

***

Прэзыдыум Менскага АВК дадаткова ўключыў у бюджэт на бягучы год выдачу 188.000 руб. для пашырэньня ў акрузе будаўнічай прамысловасьці.

***

13 мая адбыўся выпуск 95 калгасьніц і саўтасьніц, якія скончылі ў Менску курсы ахматкладу. Усе скончыўшыя накіраваны для працы ў яслі калгасаў і саўтасаў Менскай акругі.

Навіны МЦРК

З сёньняшняга дня МЦРК пачынае выдаваць пайшчыкам на наборных кніжках і ўсім сэзоньнікам (пайшчыкам і нипайшчыкам) па часовых картках: ½ кгр. воблы на едака па талёне ружовага колеру № 15, па ½ кгр. патакі на кніжку па талёне ружовага колеру № 17 і па ½ кгр. манны кукурузнай на едака па талёне ружовага колеру № 18.

***

Усе сэзоньнікі, якія не атрымалі поўнай нормы цукру на май месяц, будуць атрымліваць цукар кожны тыдзень па 250 грам.

Да ведама завочнікаў-рабфакаўцаў

Наркампрацы дазволіў аслабаніць эд работы на прадпрыемствах і ва ўстановах у працягу 4-х дзён з захаваньнем пэнсіі студэнтаў завочнікаў для здачы запікаў і ўдзелу ў канфэрэнцыі па завочным рабфаку.

Як інжынэр Сухавараў вёў агнятрывалае будаўніцтва на выстаўцы

Пры складаньні генэральнага пляну арганізацыі 1-й усебеларускай выстаўкі сельскае гаспадаркі і прамысловасьці Наркамзем БССР узяў на сябе пабудову агнятрывалага будынку на тэрыторыі выстаўкі з мэтаю папулярызацыі агнятрывалага будаўніцтва па вёсцы і наогул, каб паказаць тып будынку, якія павінны будавацца ў калгасах.

Кіраўніцтва гэтаю пабудоваю Наркамзем даручыў інжынэру Сухавараву, які складаў плян пабудовы, каштарыс на 6.000 руб. і паведаміў дырэкцыю выстаўкі аб тым, што ён лічыць патрэбным паставіць будынак грамадзкага тыпу для калгасаў на 15 сем'яў з тым, каб паказаць у ім новы быт калгасьніка. Дырэкцыя з гэтай прапановай згадзілася.

Здавалася-б, што пытаньне вырашана, гроны на будаўніцтва атрыманы. Інжынэр Сухавараў склаў плян, каштарыс і сам ахвотна ўзяўся за гэту справу. Усё гэта рабілася летам мінулага году.

Як-жа зараз выглядае гэтае агнятрывалае ўзорнае будаўніцтва? Замест паказальнага будынку для калгасу атрымалася хутарская кулацкая сяліба з чатырма вялікімі пакоямі. Прычым вамест хворасту ў сьцены (Сухавараў заявіў дырэкцыі, што ў БССР няма хворасту), наклалі каля 3 кубаў звычайных дроў, якія замазалі глінай. Вясною гліна растала і распаўзлася на сьценах будынку. Ваконныя рамы ўстаўляліся нядбайна, яны пакасіліся ўжо. На гэту пабудову патрачана звыш 6.000 руб., а карысьці зусім мала, бо агнятрывалае будаўніцтва паводле Сухаварава каштуе шмат даражэй драўлянага будаўніцтва. Інжынэр Сухавараў сам гэтым будаўніцтвам не кіраваў, а даручыў усю работу дзесятніку-тэхніку, які быў прысланы біржай працы. Наогул Сухавараў ніколі на тэрыторыю выстаўкі не паказваўся і ня бачыў, што там робіцца. Наркамзем, які ўзяў непасрэдна на сябе гэтае будаўніцтва, таксама абмежаваўся фармальнай пастановай і зусім ня цікавіўся гэтай справай.

Такім чынам, з прычыны такога галавацяпства і безгаспадарчасьці, агнятрывалае будаўніцтва на выстаўцы правалена. Між тым, пры належнай пастаноўцы работы ўзорна-паказальнае агнятрывалае будаўніцтва павінна навучыць бядняцка-сярэдняцкія масы, як трэба проста і танна займацца агнятрывалым будаўніцтвам, выкарыстоўваючы на месцы патрэбныя матар'ялы, як гліна, хвораст і невялічкі процант дрэва.

Дырэкцыя выстаўкі пастанавіла гэты будынак не паказваць на выстаўцы, як тыповы прыклад агнятрывалага будаўніцтва, і лічыць гэту пабудову шкодніцтвам.

Трэба, каб РСІ і належныя органы зацікавіліся гэтай справай і аддалі пад суд вінаватых у злачынна нядбайных і бюракратычна-казённых адносінах да арганізацыі выстаўкі і наогул да новага будаўніцтва.

Ён.

Акруговая культпрапарада

— 29-га мая склікаецца Мен. акруговая культпрапарада з наступным парадкам дня.

1. Задачы прапаганды марксызму-ленінізму ў вьязку з чарговымі задачамі партыі (дакл. т. Камянштэйн).

2. Вынікі партасьветы ў акрузе за 1929-30 навуч. год (дакл. т. Гарэлік).

3. Аб сыстэме масавай партасьветы ў горадзе і вёсцы па 1930-31 навуч. год. (дакл. Орліс), судклад АК ЛКСМБ (дакл. т. Рубенчык).

4. Аб сыстэме тэарэтычнай вучобы актыву па 1930-31 год (дакл. Модэль).

На нараду выклікаюцца загадчыкі АПА і культпропаў РК, раённыя прапагандыстыя, заг. АПА РК ЛКСМБ па горадзе і па раёне. Канфэрэнцыя працягнецца 3 дні.

ТУРКСІБ

Работа органаў ЗАГС'у па БССР

(У Сакратарыяце ЦВК БССР)

У сучасны момант у БССР існуе 1.600 органаў ЗАГС, з якіх сельскіх — 1.420, местачковых — 54, гарадзкіх—29, раённых — 90 і акруговых — 7. У рабоце органаў ЗАГС'у ёсьць некаторыя дасягненьні: пашырэньне іх сеткі і наближэньне да насельніцтва, вядзеньне работы на адпаведных мовах у нацсаветах.

Як вялікі недахоп у рабоце ЗАГС'у неабходна адзначыць слабую сувязь іх з насельніцтвам. Гэта сувязь адбываецца толькі ў тэхнічнай рэгістрацыі актаў, папулярызацыя-ж савецкага законадаўства аб шлюбе, сям'і і апецы амаль што не праводзіцца.

Органы ЗАГС'у, ня гледзячы на многія дырэктывы, даныя выканкомам і саветам, дасюль яшчэ працуюць у вельмі дрэнных памяшканьнях, няма асобных пакояў для рэгістрацыі шлюбаў і разводаў. З перадачаю-ж ЗАГС'аў у адмаддзелы нават наглядаюцца такія надапушчальныя зьявішчы, калі за адным сталом рэгіструюць шлюб, а за другім сталом, у тым-жа пакоі, міліцыя дапытае злачынцу.

Органы ЗАГС'у слаба зьвязаны з бытавымі камісіямі, сэкцыямі саветаў і грамадзкімі арганізацыямі. Удзел ЗАГС'у ў барацьбе з рэлігійнымі забабонамі і абрадамі культу зусім нязначны. Ня гледзячы на тое, што ЗАГС'ы праводзяць сваю штодзённую работу на важнейшым вучастку быту, фактычна вельмі мала робяць для пупулярызацыі і ўкараненьня сярод працоўных новага быту.

Сакратарыят ЦВК, у мэтах паляпшэньня становішча і дзейнасьці органаў ЗАГС'у, запрапанаваў усім выканкомам і саветам ужыць захады да таго, каб органы ЗАГС'у прымалі самы тыўны ўдзел у справе ажыцьцяўленьня ўсіх бытавых мерапрыемстваў, разьняволеньні працоўнай жанчыны, таксама ў антырэлігійнай рабоце; пачнуць органы ЗАГС'у ў работу быткамісій.

Сэкцыі саветаў і грамадзкім арганізацыям запрапанавана шырэй разгарнуць справаздачнасьць ЗАГС'аў перад працоўным насельніцтвам і азнаёміць апошняе з законадаўствам ураду аб шлюбе, сям'і і апецы.

Забясьпечыць усе органы ЗАГС'у асобнымі добра абсталяванымі пакоямі для рэгістрацыі шлюбаў і разводаў, укамплектаваць апарат гэтых органаў добра падрыхтаванымі грамадзкатэхнічнымі работнікамі.

НКУС і АВК даручана абмеркаваць пытаньне аб правядзеньні кароткаміновых курсаў па падрыхтоўцы работнікаў ЗАГС'у.

З лістоў рабселькораў

МАХІНАЦЫІ СЯМАШКІ

У Мар'іна - Горскім с.-г. крэдытным т-ве «Ніва» прынят на работу былы сакратар Новасёлкаўскага сельсавету, Сямашка, які на працягу трох год рабіў у сельсавеце розныя злачынствы. У 1928 годзе растраціў 200 руб. падатковых і страхавых узносаў.

Даведаўшыся, што будзе чыстка, Сямашка пакінуў работу, а пасьля чысткі зноў паступіў на работу.

РСІ, зьвярні ўвагу.

НОВАСЁЛКАВЕЦ.

ЛЕПШЫЯ АБЕДЫ—ЗНАЁМЫМ

Сталоўка ў м-ку Смалявічы знаходзіцца ў антысанітарным становішчы: брудна, накурана і нават на сталоўцы разгульваюць сабакі. Абеды падаюцца дрэннай якасьці. Калі хто жадае ўзяць адну страву, дык но даецца.

Маюць месца такія факты, калі некаторыя раённыя супрацоўнікі атрымліваюць значна лепшыя абеды на аднолькавай цане.

Работай сталоўкі трэба зацікавіць сэкцыі РСІ.

ПРАЕЖДЖІ

ПАБУДУЕМ ГРАМАДЗКУЮ ЛАЗЬНЮ

Мазырскі спажывецкі саюз адпусціў 1.000 рублёў калгасу імя Леніна, Юзвіцкага сельсавету, у выглядзе прэміі за лепшую падрыхтоўку да сяўбы.

Гэтыя грошы пойдуць на пабудову грамадзкай лазьні ў калгасе.

ФРАЙМА

УДАРНІЦТВА НЕ РАЗГОРНУТА

Завод «Зьвязда» (Мазыр) абвясьціў сябе ўдарным, але ўдарных тэмпаў няма. Цэлы рад рабочых не абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Маюць месцы выпадкі прагулаў, не паляпшаецца якасьць прадукцыі і ня вылучаны ударэйшыя брыгадзіры.

Насьценгазэта слаба асьвятляе рацыяналізацыю і самакрытыцызм.

ДАШКЕВІЧ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

— **Камвуз.** У 18 гадз.—агульны сход студэнтаў і супрацоўнікоў КУБ. Справаздача МЦРК, судаклады каапкамісіі і выбары.

— **Дом асьветы.** У 19 гадз. адкрыты сход цэх'ячэйкі КП(б)Б працасьветы школьных устаноў. Парадак дня: справаздача заг. 2-й вяч. школы і судаклад брыгады; плян працы цэх'ячэйкі. Запраш. рабочыя зав. «Камунар», «Беларуска», «Беларусь», «Бальшавік», вучком і актыў школы, члены брыгады і асьветнікі.

— У 20 гадз.—**аб'ядн. адкр. сходы цэх'ячэйкі** КП(б)Б дашкольных і палітасьветных устаноў.

Парадак дня: даклад РСІ аб выніках абсьледваньня вытворчых майстэрань. Запраш. працаўнікі бібліятэк і дашкольных устаноў.

— Кіно. Замежны баявік — **Марцін Фалькхагэн. Пач. у 20 і 22 гадз.**

— **МенАК МОПР'у.** Пасядж. інструктарскай сэкцыі. Выклік. т. т.: Канстанціноў, Файнштэйн, Ліманава, Рубінраўт, Раманаў, Левітан А., Шмэрлінг, Баранаў, Норкіна, Гурэвіч, Левітан С., Савэльсон і Кроль. У зьвязку з важнасьцю пытаньняў яўка абавязкова і без спазьненьня. Пач. у 18 гадз.

— **Дом Камасьветы** (увах. з вул. Энгэльса, пак. 19). Канфэрэнц. выкладчыкаў ВСПШ сумесна з прадстаўнікамі ад груп па пытаньні: вынікі пачальнага году. Яўка ўсіх выкладчыкаў і выбраных прадстаўнікоў ад груп абавязкова.

ЗАЎТРА.

— **Пасядж. Кастр. РК МОПР'у.** У 19 гадз. Запраш. мопр. актыў.

— **Дэкадны камвуз.** У зьвязку з тым, што 18 мая адкрываецца акруговая канфэрэнцыя, заняткі на экзаменічным цыклі адбудуцца 17 мая ў 18 гадз. (памяшк. камвузу) на тэму: «Пытаньні плянаваньня». Лектар — старшы дзяржпляну т. Гольдбэрг. Запраш. старшадарнікі-партыйцы.

ПАПРАЎКА

У газэце «Зьвязда» ад 14-га мая № 111, у артыкуле «За якасныя пакрыўкі» надрукавана: «у 1928-29 годзе было вызначана зьніжэньне сабекошту на 10 проц.», а трэба: у 1928-29 годзе было вызначана зьніжэньне сабекошту на 7 проц., фактычна-ж мы маем зьніжэньне толькі на 4,6 проц.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

КЛЮБ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ
сёньня, 16 мая адбудзецца даклад дац. БДУ тав. СЯКЕРСКАЙ
на тэму:
„Тэорыя вытворчых сіл і вытворчых суадносін"
Пачатак а 8 гадз. увечары

Сад „ПРАФІНТЭРН" 17 і 18 мая | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР 16 і 19 мая
ГАСТРОЛІ МАСКОЎСКАГА БАЛЕТУ
„ИСКУССТВО ТАНЦА"
імя Веры МАЙЯ.
Білеты ў касе тэатру і ў рабкасе. | Пачатак а 9 г. увеч.
На 16 і 17 мая УСЕ БІЛЕТЫ ПРОДАНЫ.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
ЗАВАЯВАНАЯ ЗЯМЛЯ
Вытворчасьць Белдзяржкіно
Мастацкі фільм ў 5 частках.
Кіно-штомесячнік Белдзяржкіно „Беларусь Савецкая" № 5-ЗВЫШ ПРАГРАМЫ гастролі народнай кітайскай трупы ЛЮ-КУМ-ХАЙ набачнае відовішча.
Палёт на косах. 100 піруэтаў у паветры і г. д.
Пачатак а 7 г. увеч.—КАСА—ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал
Замежны мастацкі фільм
АПОШНІЯ НАВІНЫ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
КАЛМЫКІ
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч. | Каса ад 5 г.

КІНО Пралетарый
Новы мастацкі фільм Вытворчасьці АРМЕНКІНО
ПАД ЧОРНЫМ КРЫЛОМ
у 6 частках
Пачатак 1 сэансу а 7 г.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
КУЛЬТУРФІЛЬМ
НУРЫ
у 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.
Каса адчынена—ад 12 г. дня.

КІНО Спартак
ПАТ І ПАТАШОН у фільме ПАЛІЦЭЙСКІЯ кам. у 6 частк.
Пачатак сэансаў: 7 г. 15 м., 9 г. 10 г. 30 м.
Каса—ад 5 гадз.

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: мягким золот., серебр., маслян., рельефн анилин. не расплыв. красками. Бисерн., жемчужн. и мерцающ. пересыпками. Роспись по сосудам, стеклу, целлулоиду, коже и дереву. Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Уменьше рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мел. мар.
ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО.
МО НКА, ул. Дзержинского, д. 1.

Б. Д. В. — НАВІНКІ. — Б. Д. В.

Ц. ЗАРЭЙНЫ.—Узбунтаваная зямля—нарысы. Стар. 141. Цана 55 кап.
Мастацкае слова масам.
В. СТАШЭУСКІ.—Па сонечным шляху—эскізы. Стар. 92. Цана 40 кап.
Мастацкае слова масам.
Р. МУРАШКА.—Прыгранічны манастыр—апавяданьні. Стар. 92. Цана 30 кап.
Янка МАУР.—Амок—Раман у 2-х частках—з часу паўстаньня на Яве ў 1926 годзе, з малюнкамі. Стар. 232. Цана 2 р. 70 кап.
У. СТРАКОУСКІ.—Камсамол у змаганьні за прамфінплян—матар'яны да Усебеларускага камсамольскага папітбою. Стар. 31. Цана 5 кап.
Н. ШЫБАЕУ.—Дэлегатка на вытворчасьці. Стар. 68. Цана 22 кап.
Г. ЛЕДАТ.—Антысэмітызм і антысэміты—пытаньні і адказы. Стар. 77. Цана 25 кап.
А. СТАЛЕВІЧ.—Супроць фашысцкай акупацыі—дзейнасьць беларускай с.-р. грамады ў масах. Стар. 28. Цана 15 кап.
Царская катарга і ссылка.
А. КАЛАНТАЙ.—У турме Керэнскага. Стар. 62. Цана 20 кап.
Царская катарга і ссылка.
В. СТУКАУ.—У Далёкаўсходніх турмах. Стар. 34. Цана 12 кап.
ГАНВАРОУСКІ, ДЗІХЦЯР, ЛАГУН, МАЛІНІН, РАКАУ, САЕТ—Гігіена працы—папулярныя нарысы з прадмовай Наркома Працы БССР т. Гніпякевіча. Стар. 80. Цана 50 кап.
Беларускі НДІ імя Леніна.
Г. ЧУЙКО.—Як ставіць навуковыя досьледы ў саўгасах і калгасах. Стар. 52. Цана 15 кап.
С. КУДЗІНАУ.—Новыя ільготы калгасам. Стар. 60. Цана 7 кап.
С.-г. бібліятэка.
ЧЭМЕЛАУ.—Гадоўля капусты ў полі. Стар. 93. Цана 30 кап.
В. КРАСАЧКІН.—Цыбуля і часнык. Стар. 108. Цана 70 кап.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ВСЕСОЮЗНОЕ ГОСУДАРСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ МЯСНЫХ СОВХОЗОВ
„СКОТОВОД"
доводит до сведения всех специалистов-агрономов, желающих переквалифицироваться для работы в крупных мясных совхозах, что «СКОТОВОДОМ»
ОТКРЫВАЮТСЯ с 1-го октября 1930 года
5-МЕСЯЧНЫЕ КУРСЫ
ПО ПЕРЕПОДГОТОВКЕ АГРОНОМОВ
ПРИ МОСКОВСКОМ ИНСТИТУТЕ КРУПНОГО РОГАТОГО СКОТА.
Поступающие должны иметь высшее или среднее сельскохозяйственное образование и производственный стаж не менее 3 лет. На курсы могут быть зачислены и агрономы-практики, проработавшие в сельском хозяйстве не менее 7 лет. Зачисленным на курсы предоставляется бесплатное общежитие и стипендия в размере их последних окладов, но не менее 200 рублей в месяц. Проезд за счет „СКОТОВОДА". По окончании курсов слушатели остаются работать в системе „СКОТОВОДА", удовлетворяясь при переезде по 82 ст. КЗоТ.
Срок приема заявлений до 1-го июля.
Заявления о приеме направлять в адрес „СКОТОВОДА": Москва, Чистопрудный бульвар, дом № 12-а, Управление кадрами.

Дырэкцыя МБВ чыг. паведамляе, што
З 15 МАЯ
РУХ ПАСАЖЫРСКІХ ЦЯГНІКОЎ
у Менскім вузле будзе праводзіцца ПА НАСТУПНЫМ РАСКЛАДУ:
Адпраўляцца на Маскву: кур. 20.55 м., скор. 8.55 і 22.35 м., паштовы 15.05 м., да Смаленска пас.-тав. а 17.45 м.
» » Негарэлае: кур. 10.17 м., скор. 21.30 м., пас. 5.10 м. і 17.10 м., пас.-тав. 11.00 м. і 22.00 м.
» » Радашковічы: пас.-тав. 3.35 м., 6.10 м. і 9.50 м., 17.40 м. і 19.30 м.
Прыбываць з Масквы: кур. 10.05 м., скор. 9.25 м., 21.20 м., паштовы 18.55 м., з Смаленску тав.-пас. а 7.50 м.
» » Негарэлага: кур. 20.42 м., скор. 8.39 м., пас. а 17.02 м., 4. 12 м., пас.-тав. 0.15 м. 13.10 м.
» » Радашковічы: пас.-тав. 5.50 м., 8.30 м., 13.00 м., 21.50 м. і 22.58 м.
Адпраўляцца на Гомель: пас. 1.15 м., пашт. 7.00 м., пас. 9.45 м., пас.-тав 16.40 м.
Прыбываць з Гомелю: пашт. 0.50 м., пас.-тав. 6.45 м., пас. 8.03 м. і 21.45 м.

Згубленыя і ўкрадзеныя
наступныя дакументы лічыць несапраўднымі
Пэнс. кн. № 6960 Кудрашова С. І. 85
Фабрычны нумар «294» на правуваходу на ф-ку „Беларуска" на імя Майзеля Л. Г. 85
Бірж. карт. Качана К. М., выд. Мен. бірж. працы. 85
Чл. кн. № 2689 Хаета М. Я. выд. Менсампрамкрэдытам. 85
Мэтр. вып. Гаролік С. І., выдан Мен. ЗАГС'ам. 85
Асабов. пасьведч. Кісялёва І. Д. выд. аддз. эск. сувязі. 85
Парт. біл. № 1105246, выд. Менск. АК КП(б)Б, асабов. кн., выд. б. Шацк. ВВК на імя Бернштэйна Х. Г. 858-859
Членск. біл. саюзу дравапрацаў № 2334, мэтр. вып., выд. Мен. ЗАГС'ам на імя Мавчун Д. К. 860-861
Канд. карт. № 243 Папкратава М. І., выд. ДПК 2. 862
Пасьведч. Хаімчык Т. Л., выдан Узьдзенск. 7-годкай. 863
Членск. білет саюзу СГЛР Мапушка С. Н. 864
Вайск. кн., выд. Сталінск. ваенкаматам, пашпарт, выд. Дзьмітрыеўск. міліцыяй на імя Левошка К. А. 865-866
Мэтр. вып. Шэмец М. В., выд. Менск. ЗАГС'ам. 867
Хлебн. кн. Шалькевіча І. А. выд. ТПО МБВ ч. 868
Асабов. кн. Хмыля А. В., выдан Самахвал. РВК. 869
Мэтр. вып. Лявіцінай М. Б., выдан. Менск. ЗАГС'ам. 870
Паявая кн. № 54611, выдан ТПО МБВ ч. на імя Юдзіцкага З. Я. 871
50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Друкарня Беларускае Акадэміі Навук
з 10-га мая г. г.
ПЕРАЙШЛА НА ДРУКАВАНЬНЕ ВЫКЛЮЧНА АКАДЭМІ